«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 9 (241), верасень 2026 года

# Літаратурная Беларусь

Выпуск № 9 (241) (верасень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ

facebook.com/litaraturnaja.belarus
t.me/litaraturnajabelarus

## Змест



**ПАЭЗІЯ:** радкі з новай паэмы «Выхад у космас» Сяргея ЗАКОННІКАВА.......с. 1
**ЗАПІСЫ:** памятныя абразкі Мечыслава КУРЫЛОВІЧА ................................с. 2
**ПРОЗА:** «Дробныя радасці пісьменніцкага жыцця» Алеся ВЕШТОРТА.......с. 3
**ФЕЛЬЕТОН:** «Чортава чарка» Віктара САЗОНАВА........................................с. 4
**ПАЭЗІЯ:** нізка вершаў Тамары АЎСЯННІКАВАЙ «Лес — адхланне маё» ....с. 5
**ЧЫТАЛЬНЯ:** апавяданне Паўла ЛЯХНОВІЧА «Мяне завуць “Міс”» .......с. 6, 7
**ПАЭЗІЯ:** нізка вершаў Міколы КАНАНОВІЧА «Эра маўчання»..................с. 8
**ФОРУМ:** згадкі Алены ЛІТВІНОЙ пра Ніну МАЦЯШ
і развагі Алеся КАСКО пра творчасць Міхася РУДКОЎСКАГА..................с. 9
**ЛЕТАПІС:** артыкул Ірыны МАСЛЯНІЦЫНАЙ і Міколы БАГАДЗЯЖА
«Альгердавічы: “літоўскія крэчаты” на полі Куліковым».........................с. 10
**ЛІТГІСТОРЫІ:** эсэ Ігара ВІРАБАВА пра Федэрыка Гарсія ЛОРКУ
«Быць з тымі, каго пераследуюць» ..............................................................с. 11
**СВЕТ:** навіны і цікавосткі літаратурнага замежжа....................................с. 12

**ПАЭЗІЯ**

# Выхад у космас

## Радкі паэмы



Сяргей ЗАКОННІКАЎ

*Маёй Лілі*

### Зачын

*Via est vita (Дарога — гэта жыццё). (Лац.)*

*Маё жыццё — адтуліна ў Сусвет.*
*Я ў гэта несвядома, ды паверыў*
*Яшчэ, калі навобмацак браў след,*
*Запісваў ноччу вершы на шпалерах.*

*Мне сэрца адкрывала кожны год*
*Усё, што недаступна воку, вуху.*
*Паэзіі свабода і палёт*
*Зліваліся з касмічным вечным рухам.*

*Гляджу на свет з уласнай даўніны,*
*Калі натхненнем безліч слоў адсеяў.*
*Абсяг зямны, як яблык наліўны,*
*Прасветлены любоўю аж да семак.*

*Які найлепшы ў чалавецтва мерч?*
*Як ацаніць нам шчасце і пакуты?*
*Падносіць людзям доля нават смерць,*
*Як келіх прадугледжанай атруты...*

*Нявыказаных слоў маіх святло*
*Узыдзе над забытаю магілай.*
*Жыццё нібыта доўгае было,*
*А часу мне ўсё роўна не хапіла...*

### Выпадковасць

*У космасе бясконцым пыл і газ*
*Праходзілі ў віхурах загартоўку.*
*З'яўленне абышлося і для нас*
*Мільярдамі гадоў крутой шліфоўкі.*

*Я — выпадковасць... Выпадковасць — ты...*
*Мяне магло не быць. Цябе таксама.*
*Мы ўзніклі з цемнаты і нематы*
*Жывым фіналам фантастычнай драмы.*

*Лёс існасці — няспынны чарнавік,*
*Які з'ядае тонамі чарніла...*
*Бязмежнай варыянтнасці падлік*
*Любому інтэлекту не пад сілу.*

*Калі ўсвядоміш гэта, сцісне жах,*
*Адразу сэрца захлынецца болем,*
*Бо нават як пралёг жыццёвы шлях,*
*Мы ўсё ж маглі б не ўбачыцца ніколі...*

### Салаўі над возерам

*Са свайго вяселля збеглі сцежкай стромкай*
*Да азёрных хваляў.*
*Слухаем цішком*
*Спевы салаўіныя ў гушчары чаромхі...*
*Вее вабным водарам, росным халадком.*

*Двух суседніх тонаў толькі чаргаванне,*
*Пералівы, пошчак — вось і ўвесь набор.*
*Ды паўсюль разносіцца дзіўнае гучанне,*
*Мабыць, дасягае аж да сініх зор.*

*Дотыкі дрыготкія чуйных рук і веснаў*
*І дрыжанне трэляў, іхняе зліццё*
*Нараджае раптам нечаканы вусціш,*
*Нейкае касмічнай сілы пачуццё.*

*Спевакоў не ўбачыш, гук адзін вірує...*
*Цепліцца мелодыя ў душах і ў крыві.*
*Салаўі над возерам без падзяк шчыруюць,*
*Слухаць — не наслухацца, колькі ні жыві.*

*Салаўі над возерам...*
*Салаўі...*

### Знікненне

*Звыкацца з тым, што знікнем па адным,*
*Не хочацца, але куды падзецца?*
*Закон прыроды ўзнік перадусім,*
*Такі расклад спрадвеку ў чалавецтва.*

*Звыкацца з тым, што нас не будзе ўсіх,*
*Складаней, і на гэта ёсць прычына,*
*Бо кожнаму пытанне б'е пад дых:*
*«Няўжо такое ўвогуле магчыма?»*

*Магчыма. Нам не суджана сляды*
*Пакінуць там, дзе полымя і морак.*
*Занесенае з космасу сюды,*
*Жыццё сыдзе ў варожую прастору.*

*Шукаць падобны варыянт дарма,*
*Паўтор не часты, як усім здаецца.*
*На шчасце ці на жаль, відаць, няма*
*Нідзе яшчэ такога ж чалавецтва.*

*Які тады наогул меўся толк*
*У доўгім і няпростым існаванні?*
*І сёння не адкажа нам ніхто*
*На гэтае спрадвечнае пытанне.*

*А над планетай страху галасы,*
*Хлусня ў тупік людзей знямоглых кліча...*
*Пяшчотна гладжу мілай валасы,*
*Пільней гляджу на роднае аблічча...*

*Спажыты ўжо ў будзённасці зямной*
*Адпушчаны нам пуд вядомай солі.*
*Зноў грозна над табой і нада мной*
*Павісла слова чорнае: «Ніколі...»*

### Шапку — у неба!

*Прасунуўся далёка гонкі свет,*
*Але згубіў шчаслівую падкову...*
*Спазняюся... Не той ужо імпэт,*
*Не тыя рухі і не тыя словы.*

*Ды ўсё ж вакол стаіць вячысты бор,*
*На пні старым ляжыць раскрыты сшытак.*
*Тут на радкі мае глядзяць ва ўпор*
*Нябёсы — самы непадкупны крытык.*

*Калі стаіш ля зорнага акна,*
*Шмат адшукаеш неадкрытых ісцін.*
*Я нават, як паэт, лічу здаўна*
*Метафарай саму людскую існасць.*

*Аднак знаходкі розуму, душы*
*Не часта могуць вынікова зліцца.*
*Мой чарнавік абселі мурашы,*
*Яны натужна валакуць ігліцу.*

*Яшчэ адна натхнёнасці вярста*
*Выказвае з паныласцю нязгоду.*
*Я сам у гэты момант вольным стаў,*
*Бо выпусціў задуму на свабоду.*

*Прабег скразняк удачы па спіне,*
*Хоць і не маю ў пахвальбе патрэбы,*
*Ды хочацца цяпер сівому мне,*
*Як у маленстве, кінуць шапку ў неба!*

### Парушынка ў воку

*На зорны Млечны Шлях, нібы на прызбу,*
*Я сеў, гляджу на свет зямны здалёку.*
*А ён такі, якім за долю вызнаў,*
*Свярбіць, шчыміць, бы парушынка ў воку.*

*Усё ў ім распадаецца на часткі,*
*І першымі плывуць улада, грошы.*
*На сцежках людства, надта пакручастых,*
*Без іх любы махляр гешэфт не рошыць.*

*Але ўсё роўна сэрца ўпарта тоіць*
*Матулі мову, дол і неба просінь...*
*Каму патрэбна знешняе, пустое?*
*А важна тое, што ўнутры ты носіш!*

*Вышэйшай Волі ўдзячна адкажыце*
*На ласку — ці то ранак, ці то вечар...*
*Не, недарма іскрынкі нашых жыццяў*
*Свяціліся і згаслі ў часе вечным.*

*Я не магу ніколі, хоць забіце,*
*На свет мой родны пазіраць звысоку.*
*Тым болей не пад сілу мне ў нябыце*
*Слязою вымыць парушынку з вока.*



Фота pxhere.com

***16 верасня паэт і публіцыст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Сяргей ЗАКОННІКАЎ адзначыў 80-годдзе. Віншуем нашага аўтара і жадаем яму жыццёвага здароўя і душэўнай моцы!***

# На срыжалях лёсу



Мечыслаў КУРЫЛОВІЧ
(1939—2025)

## Вочы

Сваяк па кудзелі — Казлоўскі Віктар Генрыхавіч (1962—1983), курсант Ленінградскага вышэйшага ракетна-зенітнага вучылішча, якое закончыў за тры месяцы да паяднання з Богам.

Я быў на тым пахаванні, і не дай Бог пабачыць мне яшчэ хоць раз такое гора матулі, якая хавае свайго адзінага сына. Хавалі вайскоўцы з той часці, дзе служыў Віктар. Хавалі з ваеннымі ўшанаваннямі.

З цягам часу выплацілі і даніну: высачэзны гранітны помнік. Амаль самы высокі на Гожскіх могілках, побач з якім цераз пяць гадоў знайшла прытулак і яго мама Стэфанія. Памерла ад анкалагічнага захворвання. Стрэсавы пускавы механізм рака папрацаваў напоўніцу.

Падчас выезду танка з гаража абвалілася бетонная гаражная канструкцыя, і менавіта ў той кропцы, дзе знаходзіўся Віктар. На пахаванні я запытаўся ў камандзіра часці:

— Хто вінаваты: маладзенькі, зялёны лейтэнанцік Віктар ці яшчэ хто-небудзь, хто адказваў за тэхніку бяспекі?

— Камандзір роты згубіў зорку, старшыну выгналі, — адказаў падпалкоўнік і дадаў: — У войску трэба вучыцца думаць, а Віктар яшчэ не ўмеў думаць.

Вядома ж, яшчэ не ўмеў. Не ўсе ж людзі ў дваццаць адзін год могуць быць Аляксандрам Македонскім.

Гляджу на фотаздымак Віктара і ўваскрашаю сустрэчу трыццацігадовай даўніны, калі ён са сваім бацькам быў у мяне. Вясёлы, эмацыйны, амбітны ў добрым сэнсе гэтага слова, лейтэнант. Не курыў, не піў. Толькі ў вачах, як мне падалося, нейкая загадкавая занепакоенасць: ці то туга, ці то асуджанасць. І цяпер, калі яшчэ раз сустрэўся з ім на фатаграфіі, маё перакананне не змянілася. Вочы. У іх штосьці трагічнае, як запланаваная карма.

Нешта падобнае ў мяне ўзнікае, калі ўглядаюся ў фотаздымак маладзенькай, прыгожай Яўгеніі Янішчыц. Вочы гавораць, толькі не ўсе ўмеюць прачытаць — пра што. А такія людзі ёсць.

Падчас працы ў Першым гарадскім шпіталі Гародні мяне (і не толькі) заўсёды здзіўлялі нетрывіяльныя здольнасці ўчастковага тэрапеўта. Ёй не патрэбны былі аналізы, ёй дастакова было паглядзець хвораму ў вочы. Аднаго разу я папрасіў яе пракансультаваць маю пацыентку: «Мечыслаў, супакой хворую, няма ў яе анкалогіі». Вяртаюся з хворай з той кансультацыі ў свой кабінет і думаю, як гэта няма: хірургі на чале з прафесарам падчас аперацыі бачылі сваімі вачыма цвёрдую, як камень, аграмадную пухліну, з метастазамі ў лімфавузлах па ўсім жываце. Нават кавалачак пухліны ўзялі на аналіз. Праўда, гістолаг ракавых клетак там не знайшоў, але такое бывае, хаця і не часта. Зашылі жывот і адправілі паміраць. Я зрабіў, што мог: першую групу інваліднасці і, каб не мучылася ад болю, выпісаў наркотыкі. У каляроўрэце папяровых справаздачаў, адпісак і прыпісак пра яе і забыўся. А праз год заходжу па дарозе з працы ў прадуктовы магазін — падыходзіць жанчына і ціха пытае: «Доктар, можа, вам грэчка патрэбна?» Дарэчы, грэчка была патрэбна, на паліцах прадуктовых магазінаў яе не было. Яшчэ раз пазнаёміліся, бо я яе не пазнаў. Інвалід першай групы з запушчаным ракам падстраўнікавай залозы, стройная, з вясёлай усмешкай на прывабных вуснах, працуе ў гэтай прадуктовай краме і мне ў знак падзякі за дзейсныя лекі хоча з падпрыльвка прадаць кілаграм грэчкі. Я ішоў дахаты з грэчкай і яшчэ раз думаў: што бачыла ў яе вачах мая калянжанка па працы? Напэўна, усё, што заўгодна, толькі не смерць.

## Сямейнае табу

Першапачатковую адукацыю па земляробству цётка Стася атрымала ад мамы, з цягам часу — і па вышыванні ў прафесійна-тэхнічнай школе ў Гродне. Пасля прыходу другіх Саветаў папоўніла шэрагі працоўнага класа будаўнікоў сацыялізму на водазаборнай станцыі Гародні.

Выкшталцона размаўляла на польскай, рускай і матчынай мовах. Заўсёды з усмешкай. Вострая на язык. Тамада любой кампаніі. Я неадноічы быў сведкам, калі на сямейных святкаваннях нехта адсутнічаў, то гэтага ніхто не заўважаў, а калі адсутнічала цётка Стася — заўважалі ўсе.

Мне здавалася, што дзядзьку Адама я знаю дасканала і даўно, як і сваю арыстакратычна-шляхетную цётачку Станіславу. Сціплы, нешматслоўны і заўсёды з нейкім таямнічым сумам. Але аднойчы, дзякуючы яго вялікасці выпадку, я ўбачыў, што гэта зусім іншы чалавек. І гэтае метамарфознае пераўвасабленне дзядзькі засталося ў маёй памяці назаўсёды.

Было гэта ў 1962 годзе, калі (чытаў у «Праўдзе») амерыканскія спецслужбы для зруйнавання ў Сінявокай паспяхова культывуючай монакультуры, а менавіта бульбы, закінулі тады яшчэ нікому не зразумелага жука, які быў бульбашом у квадраце, бо любіў гэтую бульбу, як ніхто на свеце. Тутэйшыя абарыгены, прынамсі, навакольных вёсак Гародні, пасля двуногага крамлёўскага, на гэтага каларадскага бульбаша асаблівай увагі не звярталі. Але ў аблвыканкаме, дзе ў той час у хлебаробным аддзеле змагаўся за плённа-высокія ўраджаі дзядзька Адам, на гэтага «прыгажуна» глядзелі крыху інакш, бо генеральнай лініяй партыі, якую ў той час ачольваў найвялікшы хлебароб Усяе Расіі Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, была пастаўлена задача: мабілізаваць на барацьбу з ворагам амерыканскага імперыялізму вучняў, студэнтаў, пэтэвушнікаў ды і ўсю, з іх задорам і імпэтам, крылата-зоркавую камсамольскую моладзь.

Не ведаю, як праводзіў мабілізацыю Адам Шаркоўскі, але аднойчы, як студэнта другога курса Гродзенскага медыцынскага інстытута, у гэтае ганаровае кола барацьбітоў з жуком ён запрасіў і мяне. Я прыняў яго прапанову не тое, што без энтузіязму, а хутчэй як просьбу па сваяцкай лініі. Праўда, была там маленькая фішка: за кожнага жучка абяцалі заплаціць тры капейкі (хлеб тады каштаваў 12, праезд у аўтобусе 4). Палазіўшы ў вёсцы Пярэсялка па бабуліным картапляным агародзе, мой запалкавы карабок за паўгадзіны ўжо цягнуў на тры рублі. Шалёныя грошы для студэнта за трыццаць хвілін працы, пры стыпэндыі ў трыццаць рублёў. І з гэтым скарбам падаўся ў аблвыканкам да дзядзькі Адама. Не памятаю, ці атрымаў я тыя тры рублі, але лекцыя Адама Шаркоўскага пра каларадскага жука мне помніцца яшчэ і сёння.

З той сустрэчы мінула пяцьдзясят гадоў. Няма ўжо дзядзькі Адама, але я заўсёды чую яго словы і бачу яго такім, якім ён быў у якасці лектара. Строгі ангельскі касцюм, белая накрухмаленая кашуля, матылёк, у вачах памаладзелыя іскрынкі, інтрыгуючыя паўзы, артыстычныя рухі рук, адметная загадкавая ўсмешка, вострыя з гумарам жарты і дасціпныя адказы на рэплікі. Каля гадзіны і без шпаргалкі, а нас у зале каля пяцідзесяці юнакоў і дзяўчат, і заварожаная цішыня. А пасля бясконцых пытанні, і асабліва ад дзяўчат. Я глядзеў на іх і зайздросціў дзядзьку. Вось бы мне такі поспех ад лепшай паловы. Вядома ж, у той польскай гаспадарчай гімназіі вывучалі рыторыку, харэаграфію, літаратуру і г. д.

Дзве постаці ў адной асобе. У пабытавым атачэнні — ціхі, стрыманы, з нейкім болем суму і трывогі — і зусім другі ў якасці лектара, прамоўцы: з узнёсла-вясёлым і дасціпна-загадкавым імпэтам і пераканаўчымі тэзамі ў Слове.

Пра прычыну дзядзькавага смутку я даведаўся значна пазней. Толькі падчас Гарбачоўскай галоснасці была раскрыта таямніца (сямейнае табу) Шаркоўскіх. Яго бацькі (мама і тата) пасля прыходу першых саветаў раздзяліл лёс кулацкага элемента. І гэты жах усё жыццё сядзеў у яго сэрцы.

## Гіпакрат

У свае 78 дзядзька Вацлаў яшчэ пехам хадзіў на працу (туды і назад 6 кіламетраў) і ўсім даказваў, што склероз як прысуд смяротнай кармы — выдумка дактароў, бо лечыцца гэтак жа лёгка, як і насмарк. І самы эфектыўны сродак, з да-Хрыстовай эпохі і на ўсе вякі, адзін: калі можна ляжаць — сядзі, калі можна сядзець — стой, а калі можна ехаць — ідзі. А пры чарцы самая здаровая закусь — не кумпяк і пальцам пханая, а капуста, памідор ды гурочак.

Яго працоўнага стажу для атрымання пенсіі хапіла б на дваіх. Працаваў рабочым на Гродзенскім гарбарным заводзе, пасля апаратарам на водазаборнай станцыі Гродна.

Аднойчы я быў сведкам яго досціпаў на тэму здароўя. Заходзіць Вацлаў у аўтобус. Месцаў сядзячых хапае. Сябрук цягне яго за крысо:

— Сядай, — а Вацлаў упіраецца:

— Мне нельга, доктар забараніў.

— А ты дай яму дзесяцідоларавую паперку, і ён дазволіць, — жартуе сябар.

— Ды не бярэ гэты доктар долараў, — з сур'ёзнай занепакоенасцю адказвае Вацлаў.

— Яшчэ што выдумаў! І хто гэта такі? — дапытваецца сябрук.

Імгненна Вацлаў аказаўся ў аўтобусе персонай нумар адзін. Усім хацелася пачуць імя доктара ў Гародні, які не бярэ на лапу. Вацлаў вытрымаў інтрыгуючую паўзу і ўсміхнуўся:

— Ты яго добра ведаеш, гэта Гіпакрат.

Вацлаў так і застаўся стаяць, але цікавасць да яго персоны адразу знікла, як і да таго доктара, які не бярэ на лапу. Бедны Гіпакрат. Не любяць яго ў Гародні і «цяжарныя» мужыкі, і мажныя з пышна-бухматымі формамі кабеткі.

А мой дзядзька ўсё-ткі прызямліўся і яшчэ доўга, але ўжо на кароткай дыстанцыі, з гарадзенскім гумарам удакладняў натапыранаму вуху субяседніка тэзісы па гіпакратаўскай тэме:

— А ты ведаеш, гэты Гіпакрат быў вельмі разумным чалавекам. Яго выналязкі ў лячэнні атэрасклероза, панскай хваробы гэта — гузік, самае галоўнае ў яго вучэнні: ты застаешся запатрабаваным у прыгожай паловы чалавецтва.

Я стаяў ззаду, і яны мяне не бачылі. Не ведаю, ці пасля таго «сакраментальнага» адкрыцця Вацлава ў яго сябра адвісла сківіца, але ў мяне яна апусцілася аж да пупа. Калі Вацлаў даехаў да апошняй патрэбнай яму кропкі прыпынку (мая была праз дзве), я выйшаў за ім.

— Вуек (тутэйшы зварот да дзядзькі), скажы, калі ласка, а дзе гэта ты чытаў у таго Гіпакрата, што адным махам вырашаў усе мужчынскія праблемы?

У той час у мяне яшчэ гіпакратаўскіх праблем не было. Вуек усміхнуўся:

— Чаго ты так хвалюешся, у цябе яшчэ ўсё наперадзе. Пойдзем да мяне, там і пагутарым.

Вуек піў напарсткамі, як былы тутэйшы шляхціч. Пасля агульнапрынятых стограмовікаў яго напарсткі мне пакаваліся здзекам, але маўчаў. Я не любіў Гіпакрата, бо па яго волі ўсё жыццё працаваў не за грошы, а за яго «Клятву». Пасля дзвухгадзінных напарсткаў (а засталося яшчэ 0,25 з 0,5) дзядзька Вацлаў падвёў рысу:

— Ты ведаеш, цяпер у Гародні гіпакратаў ад Бога няма — падаліся ў вырай, там цяплей і лепш кормяць. Хто ў Афрыку, жыды ў Ізраіль, у Амерыку. Яны ж там сваю крывінку ў бядзе не пакінуць, не так, як мы: каб маглі б, то адзін аднаго ўтапілі б у лыжцы вады. Разумных бярэ і Польшча, і Расія. Тут засталіся «не дай Божа». Выкупілі за даляры цёплыя месцы і думаюць, як вярнуць з пацыентаў патрачаныя ганарары. І наогул, мне здаецца, што наступілі перамены не толькі ў кліматычнай канцылярыі Усявышняга, але і на больш прыземленым узроўні. Ці то красці навучыліся, ці вынайшлі новае прыстасаванне, кшталту вечнага рухавіка, якое дазваляе пры першым жаданні схапіць Бога за бараду.

— Вуек, а чаго ты так уз'еўся на гэтых гіпакратаў і за якія грахі яны табе так не падабаюцца?

— Ты ведаеш, — з філасофскай усмешкай адказаў дзядзька, — нядаўна праходзіў вадзіцельскую медыцынскую камісію. Раней яна была бясплатная. Я прыходзіў да доктара з бутэлькай за тры рублі дванаццаць капеек, і ён вадзіў мяне па кабінетах. Трыццаць хвілін — і ўся камісія. А якая была ўвага. І паслухаюць, і пашчупаюць, і парадзяць. Цяпер такая ж самая камісія, толькі за грошы, афіцыйна ў касу і не на адну бутэльку, а на чатыры. І каб толькі адпіхнуць. Я ўжо два гады прымаю прастамол ад адэномы прастаты і рэгулярна хаджу да ўролага на пальцавае абследаванне, і ведаю не са слоў, як яно праводзіцца. А тут хірург адзеў пальчатку, тыкнуў пальцам у с**ку і кажа:

— Адзявайцеся, — і паклікаў наступнага.

Я заўпарціўся:

— Доктар, а як там мая адэнома, ці гладкая, ці бугрыстая, ці мяккая, ці цвёрдая, і якой яна велічыні? А ён і сказаць нічога не можа. На працягу пятнаццаці гадоў толькі і размоваў пра рэформы, і анічога не памянялася. Саўдэпаўская псіхалогія: дысцыпліна, парадак і важак з пугаю. Навучыліся, відаць, у немца. Толькі нямецкі гаспадар за гэтую дысцыпліну і парадак яшчэ і грошы работніку дае. Вунь дачка маёй братавай з Беластоку працуе медсястрой у нямецкім хоспісе. На работу яе муж і яна ездзяць кожны на сваёй машыне. Ужо так распанелі, што ім і кухня свая непатрэбная. Усёй сям'ёй у рэстаран ходзяць. А мая братавая Зюта з Беластоку? Ні дня не працавала, атрымлівае пенсію па мужу, які працаваў качагарам на Беластоцкай электроўні. Аб'ездзіла ўсю Еўропу, цяпер у дзевяностагадовым узросце яшчэ хоча паехаць у Рым, каб паглядзець на Папу Рымскага...

І ён быў вельмі шчаслівы, што яго пачуў хоць адзін чалавек, і мне падалося, што на душы ягонай стала лёгка-лёгка, быццам паспавядаўся.

Мінула больш за дзесяць гадоў, як няма дзядзькі, але яго гіпакратаўскую навуку не забываю яшчэ і сёння. Дзейсная.

# Дробныя радасці пісьменніцкага жыцця



Алесь ВЕШТОРТ

***Прысвячаецца Аксане Спрынчан***

Ранішняе сонца памалу распальвалася, дужэла, адбірала вочы, нібы лямпа. Яркая лямпа сярод аднатоннага блакітнага палатна. Ён усміхнуўся ды запаволіў хаду: няма сэнсу спяшацца. Варта адчуць кожны момант апошняга трыумфу.

Тут, сярод дрэваў, ціха й спакойна. У цені клёну мілуецца парачка, па плітцы скачуць вераб'і. Надта спакойна. Няўжо ўсё пайшло ў глум?

Ды не: вунь з-за кустоўя выскачылі маладзёны, два студэнты, а, можа, школьнікі старэйшых класаў. Адзін нясе на плячы вялікую спартыўную торбу, другі спрытна цягне з ейнага чэрава кнігі, раздае мінакам. Вось уплішчылі стосік закаханым на лаўцы. Падбеглі да старога дзядзькі з кіем — той павагаўся, пачухаў патыліцу, аднак абраў невялічкі томік і для сябе.

— Трымайце! Задарма! — надышла й Арцёмава чарга. Той правёў пальцам па хрыбтках і выхапіў тонкую белую вокладку.

— Бадай, вось гэтую вазьму... Дзякуй!

— Прыемнага дня, — маладзён трасянуў валасамі й кінуўся наўздагон таварышу.

Некалі і ў Арцёма былі доўгія валасы. І пірсінг у вуху. Некалі. У тыя часы ён насіў скуранку ды любіў артыстычна разваліцца на высокім шынковым крэсле. Тады ён кідаў публіцы звычайны сарамлівы жарцік ды ўрэшце пачынаў чытаць вершы. І нават самыя заўзятыя балбатуны неўзабаве замаўкалі, а расчырванелыя дзявочыя твары набывалі задуменныя, рамантычна-замроеныя водцені. Напраўду, гэта было даўно.

Вясновыя лісцейкі расцягнуліся паўзверх прысадаў, рыхтык святочныя сцяжкі. Падзьмуў вецер, на вадзе паднялася хваля. Уздоўж узбярэжнай зашамацелі навюткія, свежанадрукаваныя старонкі. Карнавал распачаўся.

Арцём перайшоў вуліцу і зноў сустрэў кніганошаў: гэтым разам дзяўчат. Тыя паспрабавалі даць яму яшчэ колькі кніг.

— Дзякуй, — ён жартаўліва адмахнуўся вокладкаю, — у мяне ўжо ёсць.

Дзяўчаты не сталі дарма марнаваць час і адразу прычапіліся да наступнага хадака.

Адмінрэсурс працаваў выдатна. Студэнты агулам і не разумелі, навошта лётаюць па горадзе з тымі кнігамі. Але чэрвеньскія іспыты былі ўжо блізка, і хто б даў рады адмовіцца ад аўтамата па непатрэбным прадмеце? Усяго толькі за дзясятак-другі раздадзеных кніжак.

Добра, што ён пастанавіў крыху пашпацыраваць. З акна службовага аўто плён ягонай працы так файна не пабачыць. Чаму ён, зрэшты, ніколі не хадзіў пешкі?

Водар скошанай травы на гарачай плітцы, ветрык з боку вады — нібы прыехаў на курорт. Міма імчацца бегуны, павольна праходжваюцца мамачкі з калясками. Шчыльныя шаты стрымліваюць грукат аўтамабіляў, і той магічным чынам ператвараецца ў манатонны, медытатыўны гул.

А потым зноў на ўзбярэжную — да высокага, строгага будынка з чорнымі мармуровымі калонамі. Усёй хады — пятнаццаць хвілінаў. Проста-такі гарадская ідылія камуніста часоў ранняга саюза.

Каля самых калонаў да Арцёма рушыў хударлявы хлапец з яўным намерам прапанаваць якасную дармовую літаратуру, але ягоны шлях уміг заступіў вахцёр.

— Ану пайшоў адсюдава! — кінуўся той на хлопца. — Рэжымны аб'ект, зараз міліцыю пазаву...

— Спачні, Звяглоў, — Арцём прыхапіў вартаўніка за плячо. — Гэта ж нашыя.

— Такточна, Арцемій Сцяпанавіч, але...

— Хадзі сюды, — Арцём паклікаў студэнта рукою, той асцярожна падышоў бліжэй. — Ну? Што там у цябе?

Хлапец моўчкі расшпіліў заплечнік і паказаў колькі цвёрдых хрыбткоў. Арцём на імгненне задумаўся, але раптам выцягнуў кнігі з заплечніка ды ўпхнуў асалупеламу вартаўніку.

— Трымай, Звяглоў. Пачытаеш у вольны час.

— Так точна, Арцемій Сцяпанавіч, усё прачытаю! — бадзёра выгукнуў Звяглоў.

Арцём пільна паглядзеў у ягоныя вочы. Не, гэты дакладна нічога не ведае. Можа, ніколі і не даведаецца.

А вось наверсе, відаць, ведалі ўсё. Яшчэ ў ліфце ён пачуў узбуджаныя галасы, якія разам заціхлі, ледзь толькі Арцём выйшаў з кабіны. Мусіць, з боку гэта выглядала смешна: увесь статак ягоных падначаленых знерухомеў проста пасярод калідору. Два тузіны антылопаў у гарнітурах. І кожная наструнена глядзела праз Арцёма, нібы недзе за ягонай спінаю матэрыялізаваўся, сама меней, Святы Грааль.

Ішоў час, напятасць павялічвалася, але ніхто так і не вымавіў ані слова. Здаецца, клеркі наогул не дыхалі. Было ціха, як у музеі, і толькі сцяжкі ў пяцельках пінжакоў калыхаліся пад скразняком.

— Дабрыдзень, калегі, — злітаваўся Арцём.

— Да-бррры-дзень... Да-брррыдзень...

Калегі затупалі абцасікамі па паркеце ды ўмомант разбегліся доўгімі калідорамі, даганяючы і пераганяючы адзін аднаго — каб апынуцца як мага далей ад кар'ерна небяспечнага начальніка.

Ён моўчкі пракрочыў да кабінета. Піскнула картка, гучна пстрыкнуў замок. Сакратарка скаланулася ды ўрэшце выйшла з глыбокага здранцвення.

— Арцемій Сцяпанавіч... — крыкнула яна ўслед, — вам некалькі разоў тэлефанавалі з...

— Я сёння заняты, Яніна, — перарваў яе Арцём, — тэлефанаванні не прымаю, пагатоў не прымаю наведвальнікаў.

Ён замкнуў дзверы ды шпурнуў пінжак на стол для нарадаў. Прэміяльная тканіна слізганула па празрыстым паўмесяцы, перакуліла збан з вадою і звалілася на падлогу.

Экран манітора запаліўся мяккім святлом, спінка прыемна прагнулася пад вагою цела, падладзілася пад тулава. Па разумным фатэлі ён напраўду будзе сумаваць.

Колькі разоў клацнуў мышкай.

На галоўнай зноў нейкая жаўтуха. Медыйныя плёткі, агляд смартфонаў, інтэграцыя з букмекерамі. А пасярэдзіне ягоны ўласны твар.

*Мільёны рублёў на нямэтавыя патрэбы. Новы карупцыйны скандал? (Абнаўляецца.)*

*Па дадзеных нашай крыніцы ў МУС, на пачатак траўня бягучага года 90 адсоткаў культурнага бюджэту былі змарнаваны на нямэтавыя патрэбы. У прыватнасці, дзве найвялікшыя друкарні краіны надрукавалі каля 400 тысяч асобнікаў кніг сучасных беларускіх аўтараў. Лёс накладу пакуль невядомы, аднак па факце растратаў ужо заведзена крымінальная справа, галоўным фігурантам якой ёсць Крывічанін Арцемій Сцяпанавіч...*

Ну вось і ўсё.

Арцём вымкнуў манітор і пашнарыў у партфелі. Пальцы намацалі гладкую вокладку.

Ён дастаў кніжку з кішэні і ахайна паклаў на край стала. Зноў залез у партфель, гэтым разам выцягнуў пачак цыгарэтаў, крыху пакруціў яго ў руках і запхнуў назад.

Ніколі не паліў у кабінеце — няма чаго і пачынаць.

А вось выпіць бы не зашкодзіла. Ён адчыніў шкляную шафку, паставіў на стальніцу пляшку ды кілішак. Кілішак ураз напоўніўся па крысачку.

Зазваніў тэлефон: Яніна ўсё ж прапусціла некага на лінію. Арцём націснуў на скід, зняў слухаўку з тэлефона. Затым падхапіў чарку са стальніцы і падышоў да акна.

Які ўсё ж чароўны краявід! Маленькія, лялечныя домікі каля вады, дахі чаргуюцца ламанымі формамі, далікатнымі кантрастамі, дзе-нідзе вымыкаюць асобныя дрэўцы. Па рацэ павольна слізгаюць катамараны: тудэма-сюдэма, ад моста да моста, ды ўрэшце хаваюцца ў прыбярэжным лісці.

Адно псуе настрой: схуднелы вохрысты кактус на падваконні, падарунак на першы дзень на пасадзе. Здаецца, гэта быў і апошні дзень, калі Арцём яго паліваў. Як кактус пратрываў цэлы год — сапраўдная загадка.

Цэлы год. А ён жа ж меўся ўкласціся ў два месяцы! Напраўду, кіраўніцкі фатэль моцна прыстаў да азадка.

Арцём падняў з падлогі перакулены збан і выліў рэшткі вады ў вазон, яшчэ раз зірнуў праз акно. Далёка ўнізе, амаль на самых прыступках, паркаваліся чорныя аўто. Ізноў зазваніў тэлефон, гэтым разам мабільны. Арцём намацаў у кішэні бакавую кнопку і вымкнуў гук.

Падышоў да стала, урэшце кульнуў чарку і стомлена зваліўся ў фатэль. Зрок зноў слізгануў да пляшкі, але раптам спыніўся на кніжнай вокладцы, акурат на чырвонай літары «Я».

Арцём разгарнуў кнігу ўсярэдзіне і ўголас прачытаў:

*Я так люблю жыццё,*
*што паміраць не страшна.*
*Пакіну іншым месца на Зямлі,*
*дзе ўсе аблокі ў пошуках Радзімы,*
*дзе кветкі абступаюць камяні,*
*дзе ў снезе*
*белыя сляды твае*
*не знікнуць,*
*а знікнуць*
*здрады чорныя сляды...*



Фота prof.by

# Чортава чарка



Віктар САЗОНАЎ

Чаго толькі людзі не напрыдумвалі пра алкаголь! Якіх толькі гадасцяў не нагаварылі. От жа тыя людзі! Мала ім, што адзін на другога нагаворваюць ды абгаворваюць, дык яны яшчэ і на непазнанае замахнуліся. Не ўсе, канешне, такія агрэсіўныя. Але ж бываюць злыдні.

— Ва ўсім вінаватая гарэлка, — кажуць.

А калі спытаеш:

— А каньяк?

— І каньяк, — адказваюць. — І віскі, і піва, і віно...

Нібыта купляюць гэтую прадукцыю ў гарэлачнай краме. Так і хочацца ў іх спытаць:

— А адкуль вы столькі назваў ведаеце?

Іх паслухаеш, дык гэта гарэлка ва ўсім вінаватая. І толькі яна. І што муж п'яны дахаты прыйшоў позна, і што з хаты сышоў рана, ды яшчэ бразнуўшы са злосці дзвярыма. Бо жонка нават есці не зрабіла яму пасля цяжкой працы, а толькі на мазгі ка́пала нейкімі панапрыдумванымі ёй жа самой прэтэнзіямі. А яна, аказваецца, не вінаватая ні ў чым. Бо цвярозая. А ён...

Ён таксама ні ў чым не вінаваты, калі ўжо быць шчырым да канца — як пустая бутэлька. Ва ўсім вінаваты быў каньяк. Гэта яны пазней разам прыйшлі да такой высновы. Харошая такая сямізоркавая падробка з самагонкі, зафарбаваная кавай. Хоць менавіта той каньяк і зняў у мужа да жонкі ўсе прэтэнзіі адразу пасля трэцяй чаркі. І накont не зробленай вячэры, і накont вынесеных мазгоў. Ну але ж некага трэба зрабіць вінаватым. Не сябе ж.

Ды і жонку не асабліва абвінаваціш. Яна ж цвярозая. Не заўсёды, ды вось гэтым разам — як назло.

У нас яно так. Калі ты п'яны, то ты і вінаваты. Нават калі гэта цябе застрэлілі, а не ты. Гарэлка, яна як першародны грэх. Зрабіў, не зрабіў, а ўсё адно вінаваты.

У лепшым выпадку вінен не толькі ты, яле яшчэ і гарэлка. Гэта хіба што адзінае адрозненне ад таго першароднага.

А вось і іншыя меркаванні бываюць пра алкаголь. Станоўчыя. Ды яшчэ якія! Падумайце самі, і самі сабе прызнайцеся. Толькі шчыра. Колькі людзей на зямлі па п'янцы зроблена?!

А?!

А можа, хто і з вас у тым нецвярозым працэсе таксама прымаў удзел? Ну-ну! Прызнавайцеся. А можа, і вы самі на свет не з'явіліся б без той п'янкі, пра якую і не здагадваецеся. Ды што там вы. Можа, які геній не нарадзіўся б. І што б мы тут на зямлі тады рабілі б: і без геніяў, і без алкаголю?

Каб не той алкаголь, людзей на зямлі было б значна менш. Гэта як піць даць. Дэмаграфічны крызіс быў бы нашмат глыбейшы.

Ёсць жа нешта добрае пра алкаголь, засведчанае і ў культуры нашай. Часамі нават пяшчотнае. Такіх рамантычных вершаў пра бакал віна ўдвух хіба на якую іншую тэму напішаш?

А пра белае віно ды чырвонае... Гэта ж так па-беларуску. Аж душа млее.

Ды што я ўсё нешта абстрактна. Ёсць жа рэальныя выпадкі, якія даказваюць практычную карысць гэтага напою.

Вось аднойчы пытаю ў свайго сябра:

— Валодзя, з якой нагоды сёння шахнуў?

А ён мне кажа:

— А хіба ты не ведаеш, басурман ты такі. Сёння ж вялікае рэлігійнае свята. Як такое не азначыць?!

— Як не ведаць, — адказваю я. — Толькі я яшчэ ведаю і тое, што свята то гэтае па праваслаўным календары сёння. А як яно было па каталіцкім, ты таксама хваліўся, што не абышоў бокам тае светлай даты.

— А я і каталіцкі каляндар шаную, і праваслаўны, — адказвае ён. — А калі запросяць азначыць па іудзейскай традыцыі, то і тады не адмоўлюся.

Вось бачыце. Такой рэлігійнасці можна толькі пазайздросціць. А то кажуць, што людзі пачалі ўсё менш да царкоўных святаў хіліцца. А не ўсе, як бачым. Няма чаго на ўсіх нагаворваць.

А вось уявіце, каб ён быў цвярознікам. Ну максімум адзін раз азначыў бы. Не больш. Я цяпер толькі па ім і звяраю святочныя даты. І па грыгарыянскім календары, і па юліянскім. Усё ведае на гэтую тэму. Значна больш, чым пашукавікі Гугла, Яндэкса і Штучнага Інтэлекту разам узятыя.

Некалі ў маладосці ён амаль зусім не ўжываў горкай. Яшчэ і мяне падбухторваў пайсці тым жа ганебным шляхам. А што тое пустое ад алкаголю месца, як і мусіць быць, запаўнялася нечым такім мала выносным, нават не заўважаў. Гэта калі было назіраць за ім з маёй падпітай карціны свету, вядома ж. З правільнай пазіцыі.

Ну то аднойчы адзін з нашых сяброў нават не вытрымаў і зрабіў дзіўнае на той час прадказанне:

— Наш Валодзя, — сказаў ён, — сап'ецца і стане алкаголікам раней, чым мы ўсе. Так заўсёды бывае з гэтымі цвярознікамі, — дадаў.

І зваліўся пад стол.

Але справа не ў тым, што ён прыняў гарызантальнае становішча на падлозе, як малады салдат на стрэльбішчы. А ў тым, што яго прадказанне збылося. Не ва ўсім, канешне. Не такім ён аказаўся геніяльным прадбачнікам, як упэўненасць у голасе яго прадказання. Бо спачатку ж стаў алкаголікам я, і гэтую пальму першаснасці не аддаў нікому з нашай кампаніі. Ну а ў астатнім жа яго словы аказаліся прарочкімі.

Ну а як прыстойны чалавек у гэтым свеце можа не спіцца?! Ну калі вось шчыра, паклаўшы руку на шклянку... Думаеце я на гэты свет нагаворваю? Ну дык вось вам яшчэ сюжэцік для сумленных інтэлектуалаў. Людзям несумленным і прыміТыўным можна далей не чытаць. Не зразумеюць усё адно.

— Налівай, — кажа Валодзя.

Коратка так сказаў, лаканічна. Гэта не той Валодзя, пра якога я раней казаў. Ёсць яшчэ адзін. Ён ужо быў не першы дзень, а можа і тыдзень у запоі, таму іншых слоў практычна не ўжываў. Бярог хіба сілы. Бо прадчуваў напэўна, што накавольны свет, у якім мы жывем, у пакоі яго не пакіне.

Ну дык як у ваду глядзеў. Ці як у гарэлку.

Залятае як шалёная ў памяшканне яго жонка, а за ёй і яго начальніца. Дырэктрыса, значыць. Таксама як шалёная. Хоць слова як можна было б і не ўжываць.

— Ты скаціна! — крычыць жонка.

А я думаю:

«Ну як жа так? Ён п'яны, і так не абзываецца на яе. А яна цвярозая, і так зневажае яго на людзях. Ну і які чалавек дурнейшы: п'яны ці цвярозы?».

Гэта былі не першыя мае філасофскія развагі ды і не апошнія. Але іх перарвала тады сваім скрыпучым лямантам дырэктрыса. Яе тут толькі не хапала! Ну анііякай павагі нават да філасофа! І заўважце, таксама цвярозая. Як шкло ў акулярах майго сябра.

— Алкаголік! — раўла яна.

Нібыта алкаголік — гэта сінонім слову забойца.

Валодзя хіба асэнсаваў яе паводзіны так, як і я, па-філасофску, сабраўся з сіламі і гэтак жа па-філасофску адказаў:

— Ну, алкаголік. І што? Ну ні подлае ж стварэнне я, а толькі п'яное.

— Лепш бы ты быў подлым, чым п'яным, — зараўлі тыя.

А я сяджу і думаю:

«Ну як у такім свеце не спіцца, дзе подлыя стаяць вышэй і прывабней алкаголікаў па шкале каштоўнасцяў? Вось калі подлы, то нічога страшнага, значыць. А можа, і часамі добра. Можа, спатрэбіцца гэтая якасць для чаго карыснага. А вось калі алкаголік...».

Далей пабаяўся дадумваць, каб не дакапацца да праўдзівага адказу. Мала які ён можа быць. Вырашыў вярнуцца напачатак сваіх разваг і зноў падумаў:

«Ну як тут не спіцца?»

А ў іх пытаю:

— А чаму на мяне не крычыце? Я таксама алкаголік. І таксама вось тут п'ю, з Валодзем.

Ну, гэта каб мяне подлым не палічылі, спалохаўся. Лепш алкаголікам. Хай, думаю, крычаць, пакуль ім не зойме. Бо ў мяне іншая шкала каштоўнасцяў. Там подлыя над алкаголікамі маральнай перавагі не маюць.

Дарэчы, мне Валодзя аднойчы так і сказаў. Ну не гэты, другі, а той, першы, пра якога спачатку апавядаў:

— Я бачыў людзей, якія з-за таго, што спіліся, сталі падонкамі. Забрала ў іх гарэлка прагу да прыстойнасці. Але вось чамусьці ніразу не бачыў, каб подлы чалавек спіўся. Не, падонкі не співаюцца. Яны не толькі не співаюцца, яны і напіваюцца рэдка. І то толькі з патрэбнымі людзьмі.

Таксама хіба філасаф. Не такі, як я, вядома ж. Столькі ён не выпіў. Але дастаткова высокага палёту мысліцель. Рэспект, што тут скажаш.

Ён неяк сказаў і такую мудрасць:

— Людзі кажуць, што на дне бутэлькі жыве чорт. Дык вось, не трэба дапіваць да дна. А як бачыш, што ўжо мала засталося, то варта набыць наступную пляшку.

Ды ў нас там усе філосафы. А з подлымі не сябрую. Даводзіцца з алкаголікамі. Ну а сярод гэтай публікі філосафы не рэдкасць. Часамі і геніі пападаюцца.

Ёсць з кім пагаварыць, ёсць пра што, ёсць чаму павучыцца. Не заўсёды гэтая публіка пры грашах, вось бяда. Тады ўжо не да высокай матэрыі. Ну а калі ёсць магчымасць пагаварыць па душах, то душы адпачываць.

Вось аднойчы кажа мне Валодзя. Не першы каторы, а другі. Ну, якога жонка з дырэктрысай абзывалі незаслужана і пры людзях. Пры людзях, значыць — пры мне. Ну і пры іх саміх, вядома ж. Яны то нікуды не дзеліся. А варта было б.

— А ведаеш, людзі гавораць, што чарку чалавеку сам чорт налівае, — у задуменні даносіць да мяне аб'ёмную інфармацыю.

І налівае. І мне, і сабе. Сам налівае.

— Ці, можа, сёння ты наліваць хочаш? — пытаецца.

— Ды неяк перахацелася пасля такіх слоў, — адказваю я.

А сам думаю: можа, і праўда, што чарку чалавеку сам чорт налівае?! Як мала, мяркую, мы пра гэты свет ведаем! Асабліва пра яго таемную частку. А то ўсё збяромся — і першае пытанне:

— Хто наліваць будзе?

А тут вось яно як! Аказваецца, ёсць каму наліваць заўсёды! Вось і знайшлі вінаватага. Нават калі сам сабе наліваеш, дык і там не твая віна.

— Ты не асабліва ламай галаву над гэтым, — кажа Валодзя, пабачыўшы мой заклапочана-задуменны стан. — Галоўнае, каб рука лёгкая была.

— У чорта?

— У яго.

— Дык ён не адзін, значыць. Бываюць з лёгкай рукой, а бываюць і не зусім?

— А як ты думаў?! Вось прычэпіцца з цяжкой, ну то ўсё ідзе пагана. Запоі, жонка з дырэктрысай жывёлай абзываць, цяжка назаўтра. А калі з лёгкай, дык і нічога. Можна нават паўтарыць.

Я тут прыгадаў іншую народную мудрасць, пачутую ад таго Валодзі, першага. І пачынаю не тое што сумнявацца ў словах прыяцеля, але — каб да канца разабрацца — спрачацца збіраюся. Ужо ж не першая пляшка была. Як тут без спрэчак? Сумна. Назаўтра ўспомніць не будзе чаго. Нібы і не выпівалі. Ды і падтрымаць размову трэба. А як жа без гэтага?

— А я чуў ад людзей, што чорт на дне бутэлькі жыве. А ты кажаш, ён чарку налівае.

— Ну вось, — адказвае ён. — Як многа мы яшчэ не ведаем.

І сам засумняваўся і ў першай версіі, і ў другой.

Я гэтай гісторыяй з Валодзем падзяліўся. Ну, ні з тым, першым, і не з другім, канешне ж. Другі ж сам удзельнік тае размовы. А яшчэ з адным.

Разумны такі, той Валодзя, які за сталом шмат розных рэчаў талковых распавядаў, усе аж заслухаліся. Мухі ў рот залятаплі, так слухалі яго. Нават як правільна шампанскае адкаркоўваць ведаў.

Там, аказваецца, цэлая навука. Трэба не паварочваць коркам у твар людзей, асабліва жанчын. Гэта небяспечна для цябе. І не наводзіць на люстру над сталом. А то ў адных усю закуску шклом засыпала. Занюхвалі рукавамі пасля. А так то нічога складанага. І наліваць трэба адразу пасля стрэлу, а то не будзе чаго піць.

Словам, чалавек дасведчаны, адукаваны. Адразу бачна.

...— Кажуць, праблемы з тым алкаголем бываюць, — пачаў я здалёк.

І пакрысе, чарачка за чарачкай, усё і расказаў. І пра тое, хто чарку налівае, і дзе ён жыве, і якая ў яго рука бывае.

А Валодзя так паглядзеў на мяне сурова і дапытліва, нібы хацеў пераканацца, ці не жартую, і выдаў рэзка, як палена рассек:

— Дык што цяпер: можа, не піць, па-твойму?

— Ну, я так радыкальна пытанне не ставіў, — пачаў я апраўдвацца.

Але ён мяне перабіў. Зноў так рэзка, быццам загнаў сякеру ў сцяну:

— Як вы мяне, філосафы, дастаеце сваімі сумневамі! Я табе так скажу, проста, па-нашаму, па-беларуску...

— Скажы.

І ён сказаў:

— Не намі заведзена, не нам і адмяняць. Пі давай.



Адрыян БРОЎВЕР. П'янка, 1620—1630

# Лес — адхланне маё



Тамара АЎСЯННІКАВА

***

*Я нясу сябе,*
*нібы крыштальны сасуд, —*
*страх*
*берагчы прымушае —*
*вертыкаль*
*гравітацыя*
*перамагае.*
*Я тварэнне прыроды —*
*сасуд я крыштальны,*
*дасканала НЕ даканальны.*

***

*Прастора сплюшчана,*
*скамечана,*
*Трымціць жыцця тугая ніць.*
*Святло тунеля! — міф*
*развенчаны.*
*Лісток на дрэве ледзь ліпіць.*

*А чалавек люцее век ад веку.*
*Усюды сцены, сцены, сцены…*
*І хтосьці разглядае вены —*
*Не бачыць сэнсу жыць.*

*Аб’езджаны. Стрыножаны.*
*Да сконy. І пасля —*
*Ў сцяну заложаны*
*або зямля*
*Засыпле вочы, здавіць грудзі.*

*Было так. Ёсць. І будзе.*

***

*Стыхія вершаў пакручастая,*
*Мая — няўрокам збілася,*
*Хоць перабоі сэрца частыя,*
*Душа ўсё ж не змірылася*
*З вар’яцтвам свету,*
*з болем сэрца.*
*Крычыць душа!*
*Крычыць Планета!*
*А мо пачуе крык іх Нехта?*

***

*Людзі нараджаюць людзей,*
*Людзей нараджаюць людзі.*

*Людзі забіваюць людзей,*
*Людзей забіваюць людзі.*

*Людзі ствараюць сістэмы,*
*Сістэмы руйнуюць людзей.*

*— Адкуль жа бяруцца НЕ людзі? —*
*Пытаюцца людзі ў людзей.*

*Глянь, чалавек, у люстэрка,*
*Вочы чые на цябе глядзяць:*
*Нелюдзя вочы, ці чалавека?..*

***

*Памяшканне,*
*у якім жыве чалавек,*
*як і сам чалавек,*
*знешне*
*выглядаюць прыстойна.*
*Калі зняць з іх апратку —*
*адкрыецца*
*сапраўдная сутнасць.*

***

*Я стамілася жыць па чужых*
*правілах,*
*Я стамілася быць тактоўнаю*
*і харошаю,*
*Не спраўляюся ўжо,*
*не пад сілу мне*
*З гэтай ношаю.*

*Раскудлаціць бы думкі*
*і пусціць па ветру,*
*Распіліць на сэрцы*
*жалезныя краты,*
*Сваю існасць на волю*
*выпусціць,*
*толькі —*
*Цяжка, калі адна ты.*

*Колькі ж можна быць*
*абавязанай*
*Усім на свеце, а табе —*
*чалавек ніводзін?!*
*Па руках і нагах абавязкамі*
*звязана —*
*Развяжы, Госпадзі.*

***

*Калі мяне не стане —*
*ніякіх фотаздымкаў,*
*ні шкадаванняў,*
*слоў і слёз, памінкаў.*
*Лепш памаўчыце…*
*А цела вы маё спаліце,*
*каб стала попелам, зямлёй.*
*І, можа быць, на месцы тым,*
*дзе вы развееце мой прах,*
*якая кветка расцвіце*
*або травінка ўзыдзе.*
*І я на белы свет вачамі іх*
*глядзець пачну.*
*І дасць Бог,*
*штосьці зразумею.*

*P.S. Апошняй волі мяне пазбавілі. Развеяць прах у Беларусі нельга.*

***

*Бываюць такія хвіліны,*
*што хочацца выць*
*ваўчыцаю,*
*зайсціся крыкам*
*сычыным,*
*збегчы ў поле,*
*у лес сысці,*
*каб нікога не бачыць.*

*Каб рэха разнесла*
*і крык, і выццё —*
*прастору запоўніла,*
*каб хмары дажджом*
*разам са мною рыдалі,*
*каб зоры зацята маўчалі,*
*каб вецер мой крык*
*на шматкі парваў*
*і на сметнік выкінуў.*

*І каб ніхто*
*пра гэта не знаў,*
*далі бог, не выпытаў.*

***

*О, не пытайцеся,*
*ну як я ёсць!*
*І пра здароўе не пытайцеся,*
*ні ў якім разе!*
*І зусім не трэба.*
*Усё не пастаяннае,*
*як неба,*
*як думка ў сказе,*
*як вада ці вецер.*
*І няма, не будзе ў свеце*
*нам пастаянства.*
*І зусім не трэба*
*яго шукаць.*
*Непастаянства нашае*
*патрэбней хлеба.*
*Яно так многа можа даць,*
*адкрыць і зразумець,*
*узняць!*
*О, не пытайцеся,*
*ну як я ёсць.*
*І пра здароўе не пытайцеся.*
*Ні ў якім разе…*

***

*Прахалодаю дзень ахутаў,*
*Вецер лашчыць, як любы,*
*каханы.*
*Што за лёс мне Гасподзь*
*прыдумаў:*
*Не пра лета — пра зіму*
*мае мары.*

*Нарадзілася я вясною,*
*Калі вішні цвілі, цвілі слівы,*
*Я люблю гэты час маёвы,*
*А да сэрца бліжэй усё ж зімы.*

*І не тыя — гнілыя, дажджлівыя —*
*А марозныя, снежныя, лютыя,*
*Як маленькай сядзела ля коміна,*
*Песні Зюзі й мяцеліцы слухала.*

*Дык чаму ж так душа мая рвецца*
*У дзяцінства суровае холаду?!*

***

*У тлуме дня і ночы каханыя*
*пакроць кахаць стаміліся.*
*Каханне вынеслі на сметнік*
*як непатрэбнае,*
*ад свету і сябе закрыліся.*
*Пустое месца доўга не пустуе.*
*І нелюбоў, сястра кахання родная,*
*у доме пасялілася.*
*Раскашавалася і правіць балем.*
*І гэты баль стаў болем іх,*
*яго ўжо вынесці не хопіць сілы.*
*А што з каханнем тым,*
*што стала нелюбімым?..*

*…Дзяўчынка-летуценніца ішла,*
*заўважыла няшчаснае каханне,*
*адгрэбла смецце і ўзяла,*
*і адагрэла ля сэрцайка свайго.*
*…Дасюль яны жывуць у згодзе!*



Фота Таццяны АЛЁШКА

***

*О каб вярнуць той час, калі!..*

*…ты снішся мне*
*ўсё тым жа маладым.*
*І так, як некалі,*
*душу трывожыш,*
*і адпусціць цябе*
*ўсё просіш, моліш,*
*а я не маю сіл*
*расстацца каб. І не хачу.*

*У цемру ночы нема я крычу!..*
*Цябе няма.*
*Ты — здань. Ты — дым.*
*О каб вярнуць той час, калі!..*
*Але ж…*

*Ты будзеш вечна маладым,*
*а я — так ад цябе далёка…*

***

*Ліхтары-дзьмухаўцы*
*Ўздоўж дарогі.*
*Вока Божае угары —*
*Месяц двухрогі.*
*Углядаецца ў цемру,*
*Зыркае вокам,*
*Бо яму, як і мне,*
*Адзінока.*

***

*У тлуме дня жадаю адзіноты,*
*У адзіноце трызню тлумам дня,*
*У цішыні я чую сэрца ноты,*
*У шуме глохне музыка мая.*

*Жыццё бяжыць галопам*
*і алюрам,*
*А лёсам правіць доля*
*непазбежнасці,*
*І стрэлы, што адпушчаны*
*Амурам,*
*Не мне. Святкую дзень свой*
*незалежнасці.*

***

*Думкі адпрэчу скрушныя.*
*Думкі прывечу светлыя.*

*Пакладу я думкі-недругі*
*На воблака лёгкае.*
*Ты нясі іх, лёгка воблака,*
*Праз палі бяскрайнія,*
*Праз лясы дрымучыя*
*У глыбока мора сіняе.*

***

*У лесе Любужскім*
*бываць я люблю.*
*Ён жывы для мяне,*
*субяседнік прыемны.*
*У маўчанні сваім і яго я лаўлю*
*Па-разуменне.*

*У лесе Любужскім*
*люблю я бываць.*
*Там утульна душы*
*і прыходзіць натхненне.*
*Як жа хораша мне*
*ўсведамляць:*
*Лес — збавенне!*

*Ад нягод, гарадской*
*мітульгі-мітусні*
*Лес — збавенне, адхланне маё,*
*тая кропка,*
*За якую адчайна чапляемся мы*
*Так таропка.*

***

*У лесе я не адна,*
*У лесе не адзінокая.*
*І сасонка тут мне сястра,*
*І бярозка зеленавокая.*
*Абдыму я іх па чарзе,*
*Галавой прыхінуся,*
*Верхаліна ласкава шапне:*
*— Не хвалюйся.*
*Нібы голас ахоўны мацi…*
*І на сэрцы стала святлей.*
*Быць у лесе — такое шчасце!*
*Я ў прыроды ўзяла прычасце —*
*Жыць на свеце цяпер лагадней.*

# Мяне завуць «Міс»



Павел ЛЯХНОВІЧ

Мама кажа: калі штосьці хвалюе, то перажыванне, праблему — яе трэба некаму прагаварыць, сфармуляваць. Тады лягчэй рашэнне знайсці. У мяне не тое, каб праблема, так, лухта... І нельга сказаць, што перажываю надта... І рашэння ніякага не шукаю. Проста — карціць распавесці.

Мяне ў класе «Міс Марпл» завуць. Дакладней, раней называлі, а цяпер мянушка скарацілася, стала проста «Міс». Часам «Міска». У нашым шостым «В» амаль усе з мянушкамі. Тамара Шчасная — «Рыжая». Яна сапраўды рыжая, як медны дрот. Пеця Малькевіч — «Блатны», Мішка Салавей — «Тыц». Міколка Дударчык — «Макс». Марыся Жукоўская — «Жучка»... Усе маюць. Толькі да мяне не прыліпала. Спрабавалі неяк «Трусам» называць, мы тады па беларускай літаратуры Паўлюка Труса праходзілі, а я таксама Паўлюк, Павел. Але «Трус» хутка ператварылася ў «Плюс», а потым і зусім знікла. А вось «Міска» даволі трывала прычапілася... «Міс Марпл» — гэта гераіня дэтэктываў Агаты Хрысці, самадзейная сышчыца. Я тое-сёе з гэтых твораў чытаў, тое-сёе па тэлевізары глядзеў. І мянушкай таемна ганарыўся. Бо вырашыў, як стану дарослым, на сышчыка вывучыцца, на міліцыянера.

Пачалося з таго, што я летась фільм паглядзеў, «Место встречи изменить нельзя». І так мне гэты фільм спадабаўся, што нават у снах я з капітанам Жегловым — гэта галоўны герой фільма — сустракаўся, размаўляў, дапамагаў яму з бандай «Чорная кошка» змагацца, са злодзеямі. Там яшчэ адзін герой — тата кажа, што гэта ён галоўны — старшы лейтэнант Шарапаў, але мне ўсё ж здаецца, што галоўны — Жаглоў.

Колькі сябе памятаю, я ўвесь час марыў кім-небудзь стаць. У сэнсе — вырасці, вывучыцца і авалодаць якойсьці прафесіяй. Малым быў — марыў марозіва прадаваць. Думаў — можна есці колькі захочаш. Потым мама сказала, што прадавец, каб яго есці, павінен таксама купіць. Сам у сябе! Потым — кіроўцам аўтамабіля, толькі гэтая мара ў мяне неяк хутка прайшла. Потым па чарзе: ваенным, касманаўтам, лётчыкам... А цяпер вось — хачу як капітан Жаглоў. Міліцыянерам. Я дзіўлюся з нашых хлопцаў — пытаюся, да прыкладу, у таго ж Тыца, кім ён марыць стаць, як вырасце, а ён плячыма паціскае: «Ня ведаю... Якая розніца?... Абы грошай шмат зарабляць...» — «А што ты на тыя грошы купляць будзеш?» — «Ну-у... Былі б грошы. Знайду што...»

Ага, дык вось даўно ўжо, з мінулага лета, як фільм пра Жаглова паглядзеў, хацеў міліцыянерам стаць. І неяк перад аднакласнікамі адкрыў гэтую мару. Ды я і не хаваў ніколі. Проста — нагоды не было. А летась, калі пяты скончылі, мы класам у паход пайшлі. Не ўсе, толькі хто захацеў і каго бацькі адпусцілі. На тры дні. Наш класны павёў, Уладзімер Станіслававіч. Заплечнікі раздаў, сказаў, што браць з сабою. Раніцою рушылі. Дзве траціны класа пайшло, нас у класе дваццаць адзін вучань. З Ракава павінны былі да Івянца пехатою дайсці, там музей Фрунзэ наведаць і Дзяржынскага — гэта нейкія дзеячы вайсковыя, — а яшчэ дом-музей Апалінарыя Пупко, народнага мастака, і пехатою ж назад, у Ракаў.

Спачатку весела было. Уладзімер Станіслававіч па дарозе шмат цікавага распавядаў. Пра расліны, пра вёскі, што дарогаю міналі. Ён вясёлы, наш класны, жартаўлівы. І заплечнікі, здавалася, зусім не цяжкія. Прайшлі Пярэжары, Казакі, потым па лесе — да Ісchallenges, пераабраліся на правы бераг, прайшлі крыху па лузе, каля Кіяўца на шашу выйшлі. Заплечнікі пацяжэлі, і неяк настрой знік. Нават класны змоўк. За Кіяўцом зусім нешта нявесела зрабілася. Яшчэ кіламетры са тры прайшлі, там справа ад шашы могілкі. Уладзімер Станіслававіч нас спачатку туды завёў. Аказваецца, там беларускі пісьменнік пахаваны, Вінцэнт Якуб Дунін-Марцінкевіч. А злева ад шашы, зусім блізка, зноў Ісляч. Мы ўжо ледзьве пляліся, зайшлі на могілкі, глянулі на тую магілу, яна там ля самай капліцы, з вялікім шэрым бюстам пісьменніка, і дзяўчаты пачалі канькаць, што стаміліся. Тады на беразе Ісплачы вогнішча распалілі і прывал зрабілі. Гадзіны тры адпачывалі. Дзяўчаты кашу з грэчкі зварылі, з тушонкай. Смаката невымоўная! Ляжалі на траве вакол вогнішча, Уладзімер Станіслававіч пра Фрунзэ распавядаў і пра Дзяржынскага.

Дзяржынскі, аказваецца, наш зямляк, родам з-за Івянца. Калі ў Расеі, у Піцеры цара скінулі, ён надзвычайную камісію ўзначаліў, каб з бандытамі змагацца. Я так зразумеў, што ён галоўны міліцыянер быў. Ну, тут і не вытрымаў, і сказануў, што як вырасту, таксама міліцыянерам стану. Той-сёй з аднакласнікаў хіхікнулі, і ўсё, а Уладзімер Станіслававіч неяк дзіўна на мяне паглядзеў і сказаў, што Дзяржынскі ў пятнаццаць гадоў сястру Ванду застрэліў, а з ворагамі рэвалюцыі змагаўся метадамі, якія нельга назваць дапушчальнымі: тэрорам, правакацыямі, захопам закладнікаў. А я тады сказаў, што не Дзяржынскі для мяне аўтарытэт, а капітан Жаглоў. І што я хачу быць, як ён. Хачу лавіць злодзеяў. І словы яго з фільма працытаваў: «Вор-р должен сидеть в тюрьме!» Але Уладзімер Станіслававіч спрэчку скамячыў, пра Фрунзэ стаў нешта распавядаць. Не памятаю, што. Здаецца, Фрунзэ таксама ў Івянцы жыў, у мастака Пупко. Беларусь тады пад расейскай акупацыяй была. Ці пад нямецкай?.. Хто ён такі, што рабіў — мне неяк не запомнілася.

Мянушку не тады прыляпілі, гэта пазней здарылася, увосень, ужо заняткі былі. А тым разам не да мянушак, тры гадзіны адпачынку сілаў нам няшмат прыбавілі. І ўсе са страхам думалі аб шляху да Івянца. Але Уладзімер Станіслававіч спыніў на шашы грузавік, мы пагрузіліся ў кузаў, і праз якіхсьці трыццаць хвілін ужо былі ля сценаў Івянецкага касцёла. Для чаго гэта я распавядаю? А! Гэта я здалёк гісторыю сваёй мянушкі... Мама кажа, што ў нас з татам «фамільнае» — пачаць нешта распавядаць, а потым забыцца, пра што пачалі, і распавесці пра нешта зусім іншае.

Я тады ля вогнішча пра сваю мару сказаў, каб Антосю Грынявецкую, «Тоху», уразіць. Яна прыгожая. Вельмі мне падабаецца. Ды на яе шмат хто з нашага класа, з паралельных, і нават са старэйшых увагу звяртае. А яна — ні на кога. Дарэчы, з-за яе Тыц мяне «міс Марплам» назваў. Ну, не зусім з-за яе, проста у сувязі з ёю.

Тоху я тым разам відавочна не ўразіў...

Затое ўразіў іншым, крыху пазней. Я тату і маме неяк паведаміў, што не хачу больш быць лётчыкам, буду міліцыянерам. Мама засмяялася, а тата сказаў, што міліцыянер павінен развіваць уважлівасць, памяць і быць фізічна моцным. І навучыў мяне запамінаць шмат лічбаў. Гэта называецца «мнематэхніка». Кожнай лічбе ад нуля да дзевяці прысвойваецца літара. Адзінцы — «н», двойцы — «в», тройцы — «р», чацвёрцы — «ч», пяцёрцы — «п», шасцёрцы — «ш», сямёрцы — «с», васьмёрцы — «м», дзявятцы — «д». Цяпер, калі ёсць нейкія лічбы, напрыклад 8590324610, іх можна запісаць літарамі «мпдлрвчшнл». Гэтыя літары разбіваюцца па дзве ці тры, а да іх дадаюцца галосныя, каб атрымаліся словы. Напрыклад, у нашым выпадку гэта можа быць «мапед-ліра-вочы-шынэль». Гэтыя словы трэба ўявіць як нейкую карцінку, як комікс. Чым незвычайней будзе карцінка, тым мацней яна запамінаецца. А потым ужо перарабіць гэтую карцінку назад у лічбы — справа зусім простая. Я крыху патрэніраваўся і вельмі хутка навучыўся запамінаць па трыццаць-сорак лічбаў. Прычым хоць справа-налева, хоць злева-направа. І некалькі разоў, калі захварэла настаўніца геаграфіі і мы сядзелі ў класе без справы, правёў «паказальныя выступленні». Сеў на настаўніцкае крэсла, заплюшчыў вочы, і мне кожны называў лічбу, а Макс запісваў іх на дошцы, за маёй спіной. Сам я хуценька ператвараў лічбавыя пары ў словы, словы ў «карцінкі» — і запамінаў. Потым з заплюшчанымі вачыма называў усе ў адным і другім накірунку, па ходзе — як называлі, і супраць. Мне нават заапладзіравалі, нібыта артысту! І Тоха таксама.

І яе вочы блішчэлі. Гэта было крута!

Я запомніў усе тэлефонныя нумары. Хоць яны ёсць — у «журнале» мабільніка, але ж ведаць іх напамяць карысна! Напрыклад, можа здарыцца, што свой мабільнік забыўся, а тут здарылася пільная патрэба патэлефанаваць. Просіш мабілу ў сябра, і па памяці набіраеш...

Мнематэхніку я трымаў у сакрэце. Хай думаюць, што гэта ў мяне такія надзвычайныя здольнасці. Прыемна, калі пра цябе гэтак думаюць. А яшчэ я ўсе гутаркі ўрэшце зводзіў да таго, што як вырасту, стану міліцыянерам. Сышчыкам. Рэдкая, цікавая, нават гераічная прафесія. Не кожнаму па плячы.

Я ў класе «выдатнікам» лічуся, люблю вучыцца, нешта новае даведвацца. І дзявяткі-дзясяткі мне атрымоўваць прыемна. А калі часам сямёрка, ці нават васьмёрка, я перажываю. Нікому не паказваю, але непрыемна. Раней мяне ў класе «немка» не любіла. Не ведаю, за што. Адчуваў — не любіць. Як ні стараўся — не мог у яе дзясятку атрымаць. А калі пагалоска пайшла пра маю «фенаменальную» памяць, неяк палагоднела. І — не-не, ды і пачала ставіць дзясяткі...

Каб трэніравацца, стаў кожны дзень пасля заняткаў з нататнікам па нашым мястэчку хадзіць ды нумары ўсіх сустрэчаных машын запісваць і запамінаць. А ўвечары правяраў — ці ўсе запомніў, ці правільна. Да 80 лічбаў давёў — гуляючы...

Я ўжо не разумеў — ці то я ў міліцыянеры рыхтуюся, ці мне людзей здзіўляць прыемна. Але Жаглоў у мае сны прыходзіць не перастаў. Толькі рэдка.

Тым днём я выйшаў на цэнтральную плошчу нашага мястэчка, дзе большасць крамаў і сельсавет, і ўбачыў Тоху. Стаяла ля ровара, танюткая, стрункая, і вочы яе былі поўныя слёз. Мне ажно сэрца сціснула, такая яна была няшчасная. І прыгожая.

Аказалася — яе абакралі. Пакуль хадзіла ў краму, нехта «распрануў» ровар. Скруцілі фару, дынамку, выкруцілі залатнікі з колаў. Добра, што, пакідаючы, прыкула яго да слупа, а то б зусім звялі.

Я ж будучы сышчык! І я вырашыў — зраблю ўсё магчымае, каб высушыць Тохіны вочы. Агледзеў ровар, пляцоўку ля яго ў пошуках слядоў злодзея. Удэтэктывах злачынцы заўсёды пакідалі сляды: недакуркі, пагрызеныя зубачысткі, адбіткі абутку, пальцаў, кроплі крыві. Ніякіх адбіткаў абутку, крыві на асфальце не было. Затое былі недакуркі, пяць штук, я сабраў іх і схаваў у кішэнь. Хутчэй за ўсё, на ровары можна было знайсці адбіткі пальцаў, але для мяне яны не мелі ніякай карысці, нават калі б удалося знайсці — не ўмею я па адбітках людзей шукаць.

Антося-Тоха глядзела на мае маніпуляцыі, як мне здалося, з недаверам і адначасова з надзеяй. А я не ведаў, што мне рабіць далей. Вось — сабраў недакуркі, і што?

Яна пайшла, пакаціла ровар са спушчанымі коламі, а я застаўся і напружана думаў. Мне так хацелася знайсці і вярнуць скрадзеныя рэчы! «У мяне пяць недакуркаў, — думаў я. — Не факт, што сярод іх ёсць хоць бы адзін, які кінуў злодзей. Нават, хутчэй за ўсё, яны трапілі сюды выпадкова. Не мог жа злодзей, ведаючы, што гаспадыня ровара ў краме і можа кожную хвіліну вярнуцца, адкручваць фару, дынаму, выкручваць залатнікі і пры тым спакойна дымець цыгарэтай. Не, не мог. Значыць, недакуркі тут кінуты іншымі курцамі. Добра. А раптам усё ж сярод гэтых пяці ёсць недакурак злодзея? Што тады? Як яго вызначыць? Дапусцім — нейкім чынам вызначыў. Тады наступнае: як знайсці таго, хто яго выпаліў? Не, недакуркі дапамагчы мне не маглі, і я высыпаў іх у сметніцу ля ганку адміністрацыі. Узгадаў, як важна збіраў іх ля ровара, з якой надзеяй глядзела на мяне Антося — і адчуў, што чырванею. Сорамна...

...Я сядзеў на прыступках, і галава мая раскалвалася ад спробаў прыдумаць, як знайсці злодзея і скрадзеныя рэчы. Па месцы, дзе я падабраў непатрэбныя, як выявілася, недакуркі, цыбаў грак і хітра касіў на мяне вокам. Паторкаў дзюбай у асфальт, нібыта нешта там заўважыў. Узмахнуў крыламі, падскочыў, узляцеў на брыль перад уваходам у будынак адміністрацыі і забрахаў, як сабака. Гракі — яны нібыта папугаі: запамінаюць навакольныя гукі і потым крычаць чужымі галасамі. Я безуважна прасачыў яго палёт позіркам. Грак... брахаў. Быццам хацеў мне нешта падказаць і не мог. І злаваў, што я нездагадлівы. Відэакамера! На брылі адміністрацыйнага будынка відэакамера! А на шкле дзвярэй — налепка «Вядзецца відэаназіранне». Аб'ектыў накіраваны не на тое месца, дзе стаяў прыкуты да слупа ровар Антосі, але, можа, ён усё ж трапіў у кадр? Я кінуўся ў будынак...

Доўга распавядаць, чаго гэта мне каштавала. Ма́ю на ўвазе — колькі словаў я патраціў, пакуль пераканаў паказаць мне відэазапіс. Сакратарка старшыні сельсавета завяла мяне ў памяшканне з вялікім маніторам і відэарэгістратарам, пашчоўкала «мышкай», і на экране ўзнікла плошча перад будынкам разам з крамамі і аўтобусным прыпынкам. Слуп, ля якога Антося пакінула ровар, у кадр трапіў! Зусім блізка ад краю, але трапіў!

— Глядзі, — сказала сакратарка. — Толькі нічога не чапай. Глядзі, калі час ёсць... Мне б твае клопаты!

І пайшла.

Гэтыя дарослыя думаюць, што толькі іх клопаты вартыя ўвагі!

Па плошчы перад будынкам тудысюды соўгаліся людзі, узляталі і садзіліся птушкі, спыняліся і рушылі аўтамабілі. Я нібыта вярнуўся ў часе на гадзіну назад. Але постаці, і асабліва твары людзей, былі невыразнымі, і я занепакоіўся, што гэтае вяртанне ў часе можа аказацца гэткім жа бясплённым, як і збіранне недакуркаў...

...Увага! Вось пад'ехала на ровары Антося. Спрытна саскочыла, падвяла да слупа, абнесла слуп тросікам, якога не відаць на экране, прышпіліла ровар. Забрала з багажніка... Пластыкавую торбу, здаецца? Выйшла з кадра...

Заканчэнне на стар. 7 »

# Мяне завуць «Міс»

« Заканчэнне.
Пачатак на стар. 6


Фота maximonline.com

Цягнуцца хвіліны, я напружаны, як выжла ў стойцы на цецерука. Вось плошчу перасякаюць дзве постаці. Падлеткі, прыкладна маіх гадоў. У аднаго блакітная майка, сінія нагавіцы, белы абутак, відаць, красоўкі. Вельмі знаёмая хада! З падскокам. Гэта ж Тыц, Мішка Салавей! А з ім ці не Мікола Дударчык, Макс? Так — ён! Ідуць паўз ровар. Тыц спыняецца, нешта кажа Максу. Той выходзіць з кадра, а Тыц корпаецца ў кішэні, потым падступае да Антосінага ровара. Ну, так, у яго заўсёды жалязякі ў кішэнях грымяць, ключы гаечныя, усялякія болцікі, дроцікі, адвёрткі… Без прыладаў там не вельмі і адкруціш…

…Хутка справіўся. Махае рукой — і бегма з Максам праз плошчу. Так, а праз колькі Антося з'явіцца? А я? Бач, удала ў іх атрымалася. Праз чатыры хвіліны ўжо Антося, праз дзве — я. І якія дзёрзкія! Гэта ж сярод белага дня, на вачах у людзей!

Гадзіну назад мне больш за ўсё хацелася знайсці злаодзея. Здавалася — знайду, і справа вырашана, забяру крадзеныя рэчы і аддам Антосі. Яна здзівіцца, будзе дзякаваць, а я сціпла апушчу вочы і скажу… Што скажу? Ну, маўляў, нічога асаблівага, я ж будучы сышчык, павінен абараняць пакрыўджаных… Неяк так…

І вось я ведаю, хто ўкраў. Але як забраць у Тыца з Максам крадзеныя рэчы — гэта раз. Як вярнуць іх гаспадыні — гэта два. Проста падысці ды сказаць: «Я ведаю, што гэта вы, аддайце мне крадзенае, я вярну Антосі», — мне нешта перашкаджае. Як уяўлю, дык становіцца ніякавата. Нават чамусьці сорамна, нібыта гэта я злодзей, а не Тыц і Макс. Во не думаў, што так можа быць! Ну, забяру я, дапусцім, крадзенае, і прынясу Антосі. Што яна падумае? Не магу ж я сказаць ёй, што гэта нашы аднакласнікі яе абакралі! З Тыцам і Максам мы не тое што сябруем, але адносіны, можна сказаць, добрыя. І вось я аб'яўляю іх злодзеямі. Не, і гэтага я не магу. Тады што? Проста моўчкі аддаць? Можа, вырашыць, што гэта я сам скруціў, а цяпер вяртаю, каб перад ёю выслужыцца? Можа.

Ніколі б не падумаў, што ў сышчыка гэткія праблемы паўстаюць. Вось ведаю злачынцаў, а што далей? Як хоць бы рэчы забраць? Хіба з татам параіцца?

…Тата доўга выпытваў, што і як. І чаго я раптам вырашыў заняцца «следствам», і як знайшоў злодзеяў, і што хачу атрымаць у выніку. Ён ужо забыўся, што я буду міліцыянерам. Давялося яму ўсё распавядаць. Пра Жаглова з Шарапавым, пра маю мару стаць сышчыкам, пра Антосю, якой хачу вярнуць рэчы, пра аднакласнікаў, якія скралі, пра тое, што мне чамусьці сорамна сказаць «злодзеі» на Тыца і Макса, сорамна вяртаць рэчы…

«Добра… — сказаў тата. — Ты выявіў злодзеяў і хочаш забраць у іх скрадзеныя рэчы гэтай дзяўчынкі, так? І пры тым не хочаш, каб усе даведаліся, што кралі менавіта яны? А ці разумееш ты, што ў такім выпадку ты становішся іхнім «падзельнікам»? Нават калі табе ўдасца неяк забраць крадзенае і вярнуць, хлопцы гэтыя будуць працягваць красці, бо ніякага пакарання, што прымусіла б іх задумацца пра недапушчальнасць браць чужое ці проста баяцца браць, не адбудзецца? А чаму б табе не аб'явіць публічна, што гэтыя твае аднакласнікі — злодзеі? Баішся, што да цябе будуць кепска ставіцца? Так, будуць. Могуць нават адлупцаваць. Але ж яны злодзеі! А ты — «следчы»! Злодзеі заўсёды варагуюць са следчымі… Мусяць варагаваць! Можа, лепей пайсці са сваёй інфармацыяй у міліцыю? І, між іншым, калі ты рэалізуеш сваю мару, гэтак жа будзе ў тваім дарослым жыцці. Ну — як? Яшчэ не перадумаў ісці ў следчыя?»

Я хвілінку падумаў і сказаў тату, што не, не перадумаў. І што заяўляць у міліцыю не хачу. Усё ж аднакласнікі. І гатовы іх выкрыць. Але не перад усім класам, а толькі перад Антосяй.

Тады тата сказаў, што, на яго думку, трэба пагаварыць паасобку з Тыцам і Максам, сказаць, што бачыў іхні ганебны ўчынак, і калі яны самі не аддадуць крадзенае гаспадыні, я гатовы зрабіць гэта за іх. Калі будуць упарціцца, прыстрашыць міліцыяй. А яшчэ сказаў, што маё нежаданне публічна выкрыць аднакласнікаў — прымета прафесійнай няздатнасці да працы сышчыка, шлях у карупцыянеры. Растлумачыў, што «карупцыянер» — гэта чалавек, які мае пэўную ўладу і выкарыстоўвае яе для атрымання асабістай выгады. Глупства! Якую выгаду я атрымліваю, калі не хачу аб'явіць у класе, хто злодзей? Мне проста не хочацца, каб клас палічыў мяне даносчыкам. І якую ўладу я маю над Тыцам і Максам? Ніякай!

…Увечары я знайшоў Мішку-Тыца, адазваў яго ўбок і пацікавіўся, ці ведае ён, што нехта абакраў ровар Антосі. Мішка захваляваўся, пачаў хаваць вочы і сказаў, што не, няе ведае. Тады я распавёў яму ўсё, што бачыў на запісу камеры відэаназірання. Праўда, пра камеру казаць не стаў, паведаміў, што нібыта знаходзіўся непадалёк і бачыў усё на свае вочы. Для чаго прамаўчаў пра камеру — сам не ведаю. Не люблю хлусіць, а тут практычна салгаў проста так, ні для чаго.

Мішка захваляваўся яшчэ болей, пакрыўся плямамі і пачаў прасіць не выдаваць іх з Максам. Сказаў, што забярэ ў Макса фару і залатнікі — дынамка ў яго — і патаемна верне ўсё назад, прыкруціць на ровар. А я падумаў, што гэтак было б найлепш, але дзе ён збіраецца рабіць гэтую аперацыю па вяртанні — пасля крадзяжу Антося, хутчэй за ўсё, ні на хвіліну не пакіне ровар без нагляду. Ды і вельмі хацелася мне ўласнаручна вярнуць крадзенае. Таму прапанаваў неадкладна аддаць рэчы мне.

Сваю «долю» Тыц прынёс мне праз дзесяць хвілін. Потым пайшоў да Макса і вярнуўся з ім разам. Макс быў раззлаваны і пачаў мне пагражаць расправай. Хлопец ён здаровы, самы дужы ў класе, ды яшчэ Тыц побач, таму мне стала ніякавата. Засмактала пад лыжачкай, узмакрэлі далоні. Але выгляду, што мне страшнавата, я не паказаў, а сам пайшоў у наступ і прыгразіў, што пра крадзеж раскажу Антосі і міліцыі. Тады Тыц адвёў Макса ўбок, яны пагаманілі ўпаўголаса, і Макс крыху збавіў тон: «Ці не сорамна табе быць стукачом? Ты ж сваіх выдаеш!» Тут я зноў ляпнуў пра сваю мару стаць сышчыкам, выкрываць злачынцаў, і Тыц фыркнуў: «Гляньце на яго! Міс Марпл!»

Назаўтра ў школе я працягнуў Антосі пластыкавы пакет з яе рэчамі. «Сама ўсталяваць здолееш ці дапамагчы?»

Антося спачатку не зразумела, зазірнула ў пакет, потым завойкала, заахала, і ў вачах яе я прачытаў нешта такое, што мне вельмі спадабалася. За такі позірк можна горы перавярнуць.

А хто ўкраў і як я знайшоў — не распавёў. Сказаў, што гэта прафесійны сакрэт, і калі пра яго ўсе будуць ведаць, гэта дасць злачынцам шанец пазбегнуць выкрыцця. Так што Тыц з Максам ніякай кары не атрымалі, а я набыў ворагаў. І новую мянушку. Бо Тыц з Максам пачалі зваць мяне «Міс Марпл», і яе вельмі хутка падхапілі ўсе.

Няпроста гэта, аказваецца, быць сышчыкам.

Яно і добра, што няпроста. Простыя прафесіі, дзе не трэба ніякай падрыхтоўкі, яны, на мой погляд, нецікавыя. Хоць, можа, патрэбныя больш, чым іншыя. Напрыклад, колькі краіне патрэбна сышчыкаў і колькі землякопаў? Або целаахоўнікаў і кіроўцаў? Мастакоў і агароднікаў? Хоць нельга сказаць, што кіроўцу ці агародніку не трэба ніякай падрыхтоўкі… А землякопу — фізічнай моцы…

Пасля «справы» з Тохіным роварам тата пачаў часцей са мной гутарыць. Падобна на тое, што яму не вельмі падабаецца мая мара. Нядаўна завяліся з ім пра Жаглова. Тата сцвярджае, што ён зусім не герой, а нават наадварот — сам злачынец. Я, натуральна, кінуўся ў спрэчку, бо тата абразіў майго самага любімага чалавека. А тата сказаў, што я проста пад уражаннем таленту Уладзімера Высоцкага, які сыграў Жаглова ў фільме. А насамрэч Жаглоў — адмоўная фігура. І даў мне кнігу «Эра міласэрнасці», якую напісалі браты Вайнеры. Сказаў, што ніколі ніякі фільм нельга параўнаць з кнігай, па якой ён зняты. Кніга заўсёды больш поўная і больш цікавая. Апрача таго, кніга вымушае чалавека працаваць: чытаць, уяўляць прачытанае, трэніраваць мозг. А фільм — гэта для лайдакоў з беднай фантазіяй. На той кніжцы, на вокладцы — Жаглоў і Шарапаў з фільма. У сэнсе, для афармлення кніжкі ўзялі партрэты Высоцкага і Конкіна, якія сыгралі ў фільме ролі Жаглова і Шарапава. Каб не гэтыя партрэты, я, відаць бы, не стаў яе чытаць. А твары маіх «куміраў» спакусілі, зацікавілі.

Кніжка мяне захапіла. Сапраўды, чытаць — велізарнае задавальненне! Я ж фільм увесь напамяць… — «Значыцца, так!..», «…Гэта толькі ты разумны, а я так, на шпацыр выйшаў…», «Вор должен сидеть в тюрьме!»… — і ў кніжцы героі тымі ж словамі размаўляюць. Але вось такі сказ: «…А яна раптам зрабіла няўлоўны рух, струменьчыкам вады слізганула з футра і ўжо амаль паспела скінуць яго…» — як смачна напісана! І як гэтую фразу можна паказаць у кіно? Ніяк! Атрымліваецца, што фільм — толькі вартая жалю, абрэзаная спроба паўтарыць сюжэт кнігі. А мова яе, манера падачы — гэта ж велізарнае задавальненне! Не меншае, чым апісаныя падзеі. І значыць — праўду тата сказаў! — кніга непараўнальна больш багатая, чым фільм.

Спачатку я чытаў пра прыгоды Жаглова і Шарапава і ўяўляў менавіта кінагероў. Пасля фільма я ніяк не мог уявіць іх інакш. Але чым далей чытаў, тым больш расплываўся ў маім уяўленні Жаглоў-Высоцкі, і на яго месцы ствараўся грубы і самаўпэўнены чалавек, які імкнецца да сваёй мэты, не зважаючы на іншых людзей, на правільнасць сваіх учынкаў. Хоча быць ва ўсім найлепшым — так, гэта добра. Так, — Жаглоў адважны, умелы. Так — нават спагадлівы. Аддаў жа сваю прадуктовую картку! Але эпізод, калі Жаглоў сілай засоўвае кішэннаму злодзею Сапрыкіну-Кірпічу за пазуху кашалёк, а потым пры панятых і пацярпелай дастае яго, мяне непрыемна ўразіў. У фільме Жаглоў засунуў кашалёк у кішэнь Сапрыкіна таемна, і я чамусьці ўспрыняў гэта нармальна — бо Кірпіч насамрэч жа скраў яго ў жанчыны! Цяпер жа, пасля прачытання, я падумаў: не, не ўсё роўна, якім чынам злачынца трапляе ў турму. Ён на тое і злачынца, каб быць падступным, подлым, жорсткім. А абаронца людзей, змагар са злачынствам павінен быць высакародным, шчырым, годным чалавекам. Інакш чым ён адрозніваецца ад таго, з кім змагаецца? І пасля гэтага эпізоду твар кніжнага Жаглова паступова перастаў быць для мяне тварам Высоцкага. Ды і Жаглоў з фільма неяк незаўважна перастаў прыходзіць да мяне ў сны.

Мне ўсё меней хочацца станавіцца міліцыянерам. Чамусьці сорамна сабе ў гэтым прызнацца. Калі я «здраджваў» прадаўцу, кіроўцу, касманаўту — рабілася гэта лёгка. А цяпер аднекуль адчуванне, быццам здзейсніў нешта непрыстойнае, пра што сорамна распавесці сябрам.

А сябры не ведаюць і па-ранейшаму завуць мяне «Міс»…

# Эра маўчання



Мікола КАНАНОВІЧ

## Дом

*На клетачным узроўні*
*Мы пакідаем дом,*
*Каб шлях таптаць няроўны*
*Пад снегам і дажджом,*
*Каб згодна запаветам*
*Жыццё сваё пражыць,*
*Каб недзе там, за светам,*
*Пра родны дом забыць,*
*Бо стаў сілом ён, пасткай,*
*Што зловіць і заб'е.*
*Не боскай і не наскай*
*Ён служыць старане.*
*Як дом не выбіраюць —*
*Ўцякаюць ад яго.*
*І дзе потым знікаюць*
*Сляды жыцця таго —*
*А дому ўжо няважна,*
*Чужому назаўжды...*
*Парвата апранашка,*
*Замецены сляды.*

***2026***

## Учора

*Учора пілі з вячора,*
*А сёння з рання.*
*Учора спявалі хорам,*
*А сёння адна*

*Туга зацягвае песню*
*Пра нэндзу жыцця*
*Старога ў пару вясенню,*
*Калі пахне ралля.*

*Учора былі маладыя*
*Надзеі і крозы мар,*
*А сёння дубы векавыя*
*Шэпчуць: «Пара*

*У край тых нязбытных мараў,*
*У небыць саму*
*Без бур і жыццёвых драмаў*
*Злажыць галаву».*

*Ды шэпт дубоў адзінокіх*
*Не хочацца слухаць нам,*
*А з радасцяў тут нямногіх*
*Нальем па сто грам.*

*Учора пілі з вячора,*
*Сёння вып'ем з рання,*
*Каб небыць прыйшла няскора,*
*Каб пахла ралля.*

## Адвечнае

*Чарговае лета нагрэла*
*І кветкі, і дрэвы, і цела,*
*Якое хаваецца ў ценю*
*Ды канстатуе: «Пацею!»*

*А потым касматая хмара*
*Над прасторам раптоўна паўстала.*
*Ліло з тае хмары, цадзіла*
*Дажджу асвяжальнага дзіва.*

*Грымела і бліскала ў небе,*
*Распалася хмара на зрэб'е,*
*Пасля праяснела, і дождж*
*Не ліў ужо больш.*

*Памытае выплыла сонца,*
*Каб свяціць над зямлёю бясконца,*
*Каб цела ўлетку пацела,*
*А зямля зноў дажджу захацела.*

## Дождж і град

*Як мае быць палье дождж грады,*
*Прамые дах і неба сінь,*
*Калі ж пасыпле з неба градам,*
*То з шыбы зваліцца матыль,*

*На градах град паб'е капусту,*
*Па памідорах добра дасць,*
*А з дыняў хутка зробіць пустку,*
*Іх сёлета не смакаваць.*

*Нядобры град, а дождж харошы,*
*Хоць з градам выпаў неўпапад.*
*Ды гаспадыня, меўшы грошы,*
*Пасадзіць дыняў новы рад.*

## Закрылі ўсё

*Закрылі ўсё — магілы і труніцы.*
*На могілках душы — спакой і ціш.*
*Нябожчыца не вяжа шаль на спіцах,*
*Каля яе магілы ты маўчыш.*

*Што не сказаў — не мовіш больш ніколі.*
*На ўсё свой час. І час той праміnуў,*
*Скаціўся спелым яблыкам паволі,*
*І знік навечна ў старыну.*

*Закрылі ўсё — згрызноты і трывогі.*
*На могілках душы спакой і ціш.*
*Паволі ты перастаўляеш ногі*
*Ў той бок, дзе дыхаеш яшчэ —*
*і ўжо маўчыш.*

***

*Музыка пахне дажджом*
*На ўвесь дом.*
*Зарослы мужык за сталом*
*Віно п'е нагбом*
*З глінянага збана,*
*П'е апантана.*
*Расце ў агародзе трава,*
*Будзе заўтра балець галава*
*Ў мужыка,*
*А пакуль*
*Музыка пахне дажджом*
*На ўвесь дом.*
*Зарослы мужык за сталом*
*Віно п'е нагбом*
*З глінянага збана,*
*П'е апантана...*

## Паэт і лета

*Цені дрэў, будынкаў цені,*
*Сонца мітусня*
*Хіляць да санлівай лені*
*На працягу дня.*

*Гэта стомленае лета,*
*Ліпень залаты*
*Цягнуць адпачыць паэта,*
*Не пісаць лухты.*

*Хутка спёка да +30,*
*То хавайся ў цень*
*І будзь там, як мужны рыцар,*
*Што бароніць лень.*

*Не пішы, не думай нават,*
*Не шукай красу*
*Ды не ўшчыняй ні гвалт,*
*ні лямант,*
*Убачыўшы асу.*

*Аса цябе не ўкусіць у ценю,*
*Ёй не да цябе,*
*Уся сасмягла ад трымцення,*
*Горача асе.*

*То і ты не варушыся,*
*Ціхенька сядзі*
*І на сонечныя блікі*
*З ценю не глядзі.*

*Лепш заплюшчвай свае вочы,*
*Хай агорне сон.*
*І праспіш так мо да ночы*
*Пад пчаліны звон.*

*А, прачнуўшыся, успомніш,*
*Што даўно не еў,*
*Ды на ноч кіндзюк напоўніш*
*Ты пад жончын гнеў,*

*Пачытаеш мо навіны,*
*Фільм мо паглядзіш*
*Ды да пекнай палавіны*
*Ў ложак пабяжыш.*



Фота pxhere.com

## Света і «Воўча»

***Памяці Святланы Курс (Евы Вежнавец)***

*Згарэла Света. Спалілі Свету.*
*Застаўся «Воўча» блукаць без мэты.*
*На ўсім на гэтым на белым свеце*
*Жыць будзе «Воўча»*, не будзе Светы.*

*Вяртае памяць мне вобраз светлы:*
*«Міколка, мілы...» — пісала Света*
*Мне не сваяі не чужая,*
*Ўжо назаўсёды маладая.*

## Наша літаратура

*Тонкія «Полымі»**,*
*Тоўстыя «Дзеясловы»***.*
*Мы ў нашай літаратуры*
*Да знікнення не гатовы.*
*Ды знік «Дзеяслоў»,*
*Патанчэла «Полымя».*
*Вайна ізноў*
*Вядзецца за галавы*
*Нямногіх тых,*
*Хто чытае роднае,*
*Каго б'е пад дых*
*Эпоха бясплодная.*
*Шмат было ў нас эпох такіх —*
*Выжылі, перажылі мы іх,*
*Хоць пры тым вылазілі*
*З душы і скуры,*
*Гатовымі знікнуць не былі*
*Мы ў нашай літаратуры.*

## Беларускае маўчанне

*Мы жывем у журботнай самоце,*
*Хоць бывае нас двое і больш,*
*Ды чым больш, тым ніжэй адзіноце*
*Нахіляем мы свой макентош.*

*Пагубляліся ў безданях часу*
*Сябры блізкія і сваякі,*
*А сустрэнь — не пазнаеш адразу,*
*Чалавек стаў як быццам другі.*

*Ды і тыя, хто побач, не вельмі*
*Каб спрыяльна глядзелі ў твой бок.*
*Берагуць мо здароўе і нервы —*
*Не дай бог што сказаць незнарок...*

*То маўчым у тэлефонах і побач,*
*У журботнай самоце жывем,*
*Адзіноту хаваем і горыч*
*Да якіхсьці яшчэ перамен.*

***

*Трава сцюдзёнаю расой*
*За тыдзень прагна наталілася*
*Ды зноў зялёнаю красой*
*Мне пад касою нахілілася.*

*І кроплі буйныя расы,*
*Як слёзы, ніц на зямлю падалі,*
*Ў касца ж макрэлі валасы*
*Ды з твару пот каціўсяградамі.*

*З вясны да восені касьба*
*Травы ўжо болей непатрэбнае*
*Даецца ў знакі, як хацьба*
*Камбайнам тым на поле хлебнае.*

*Калісьці з бацькам жаў авёс*
*Якраз у гэту пору жніўную,*
*І «Ніва» з чатырох калёс*
*Збірала ў бункер зерне дзіўнае,*

*Якое еў калгасны конь*
*Улетку, восенню, зімою*
*І быў гарачы, як агонь,*
*Пакуль... не стаўся каўбасою.*

*Канюшня тая і калгас,*
*Як маці з бацькам — у мінулым.*
*І я кароў сваіх адпас*
*Ды ўсё хаджу касцом панурым*

*І па надварку і вакол,*
*На вуліцы, за роднай хатай*
*Я трымерам турбую дол,*
*Змагаюся з травой зацята.*

*А непатрэбная трава*
*Расла, расце і расці будзе,*
*Калі й мая ўжо галава*
*І пра траву й пра ўсё забудзе.*

***

*Хто на клунках, хто на чамаданах,*
*Так заўжды, чакаючы, сядзім,*
*Нехта дома, хтосьці на вакзалах,*
*І ў гадзіннік соты раз глядзім.*

*Ды наш транспарт хутка не прыходзіць,*
*А як прыйдзе, то ўжо павязе*
*Каго ў бок, дзе сонца узыходзіць,*
*А кагось на захад панясе.*

*Вечна развітанні, раздарожжы...*
*І звініць, як адзінота, даль.*
*Сумна, ці вусцішна, ці трывожна —*
*Цісні газ, кіроўца, паганяй!*

***2026***

* «Воўча» — «Па што ідзеш, воўча?», раман Евы Вежнавец.
** «Полымя» — беларускі дзяржаўны літаратурны часопіс.
*** «Дзеяслоў» — беларускі прыватны літаратурны часопіс.

# Адлятае ў вырай рой…

Алена ЛІТВІНА (МАЦЯШ)

Дзень Яе нараджэння[1], ды ўжо без Яе. Затым угодкі з дня Яе смерці… Адчуванне нейкай суцэльнай ірэальнасці. Пуста. Глуха. Моташна. Не хочацца нікога пускаць у свой смутак. І плакаць не магу. О, гэтая мацяшоўская ашчаднасць, стрыманасць! Як пісала Ніна: «Ды няма ў нас такой завядзёнкі…». І вось забілася я ў сваю ракавіну — ракавіну свайго маўчання. Боль, які не адпускае, ды, пэўна, ужо і не адпусціць, хоць і прыціхае з часам і ямчэ пераліваецца нечакана для самой сябе на ўласныя вершы. (Дзякуй «Літаратурнай Беларусі», якая надрукавала некаторыя з іх разам з нарысам Анатоля Вярцінскага «Сёстры Ніны Мацяш».)

Сыход сястры ў іншасвет спарадзіў столькі шчырых водгукаў-спачуванняў, што мне часам здавалася: Ніна прыадкрывае вечка сваёй «схованкі», каб паспагадаць, паратаваць маё сэрца ад нясцерпнага болю, ад разрыву, паняньkaваць мяне, як некалі ў нашым з ёй мінулым. Мне так не хапае яе ўсмешкі, яе спачування, яе развагі. І ямчэ мучыць усведамленне, што пры жыцці не дазваляла сабе «слабасці» пашкадаваць яе след як след яе самую (параліош на яе, гэтую самую мацяшоўскую ашчаднасць), што, здаецца, ніколі не гаварыла ёй на поўны голас, як я Яе люблю і шкадую, як захапляюся Ёй, як дзіўлюся яе мужнасцю так жыць, яе мудрасцю (якая ж я дурненькая ў параўнанні з ёй), яе разважлівасцю (усё раскладзе па сваіх палічках), яе уменню абнадзеіць і падтрымаць, яе тонкай душэўнасці і выкшталцонаму, шляхетнаму, як у маці (хоць і мужычка), густу і ў рэшце рэшт — яе таленту.

З другога боку, я лічыла лішнім ускладаць на яе кволыя плечы свае асабістыя болькі і турботы, старалася ўсяляк ахоўваць яе спакой. Як толькі не абзывала мяне за гэта: «казярожыцай» (мой знак задыяка — Казярог), «сухім вожыкам», «скарынкаю». Але, праўда, і «апіркаю», бо ведала, што заўжды пры любых акалічнасцях, адгукнуся па першым званку, дапамагу па першай просьбе. Пра гэта нам і гаварыць не трэба было — само сабой разумелася. А яна так мала ад мяне хацела. Так мала. І як цяпер жыць, памятаючы пра гэта? Як забыць яе сумныя вочы і развітальнае: «Ты — лепшая»? Я ж вочы адвяла, не прыгарнула, не дала выйсця свайму пачуццю. «Кожны сам сабе капае студню, кожнага свой плуг вядзе»…

Яе развітальныя позіркі і словы… Яны даюць мне падставу сведчыць, што адметная велічнасць яе жыцця ямчэ і ў тым, што Яна, усведамляючы, пэўна, хуткаплыннасць і часовасць зямнога, не пераставала жахалася перспектывы хуткага сконy. Яе, здаецца мне, не прыгнятала жорсткая непазбежнасць смерці. Больш за тое, у апошнія свае дні так многа і так шчодра выказвала яна і ласку, і пяшчоту, і шкадаванне, і спагаду, так старалася ўсё дарабіць, давыканаць, даспавядацца, надарыць дарэшты ўсіх нас святлом сваёй душы.

Жыццё без Ніны пражыла так, быццам праседзела ў пустой цёмнай зале на сеансе чорна-белага кіно: вакол людзі — а пуста, свеціць сонца — а цяпла няма, светла — а ноч, дыхаеш — а не выдыхаецца. Праўда, зрэдку спахопліваюся: чаго гэта я так? Ніна ж і ў сваім жыцці, і ў вершах сваіх паказвала прыклад мужнасці і цярпення, «умення жыць не ў спаняверцы». Яна ж і пісала:

*Даецца жыццё нам,*
*Каб радасць з адчаем*
*Вучыліся мы прымірaць.*

І ямчэ сказала, быццам пакідала нам наказ: «Ёсць адзінае выйсце — жыць!» Быццам загадзя давала сілы не зрывацца ў прорву безнадзея і самоты.

У нашай ніўскай старане ёсць звычай: каб са смерцю блізкіх табе не ўпасці ў грэх адчаю і смутку, бяруць шчопаць пясочку з магілы і насыпаюць табе за каўнер. Так было не раз і са мною, калі закрывала вочы і маці, і бацьку, і сёстрам. А цяпер вось як апошняя з роду, ці, як бы сказала Ніна, апошняя ў нашым радавым спісе Эрэтэку, сыплю шчопаць за шчопаццю салёны ад нявыплаканых слёз пясок у радкі сваіх вершаў… Да дня нараджэння сястры напісаўся верш «Пчаліны рой».

Чаму такая назва, такая тэма? У бацькі была пасека. І сталася так, што свой пчаліны клопат ён перадаў менавіта мне, наймалодшай, якая да здранцвення, да смерці баялася пчол. Баялася, але калі вясною 2007 года пасека гінула, а бацька быў ужо зусім слабы, то мы з Колем узяліся яе аднаўляць: паставілі ў лесе лавушкі і заманілі ў іх некалькі раёў. Бацька ямчэ паспеў парадаваца. А за дзень да яго смерці прысніўся сон: усе чыста пчолы падняліся з вулляў услед за маткай і растварыліся ў небе. З трывогаю, памятаю, расказала сон Ніне. Ну а цяпер вось, можа, не столькі напісаўся, колькі прысніўся гэты верш…

*Ці бачыў хто,*
*як вулей — родны дом свой —*
*збіраецца пакінуць рой?*
*Шчэ зночы матка самавітая*
*рыхтуе-дзеліць дружную сям'ю:*
*каму застацца тут і тут,*
*а каму час збірацца да адлёту.*
*Немітуслiва ціхім поўднем*
*з вузкай шчыліны лятка*
*шыбуюць пчолы.*
*З радасным гудзеннем*
*шырокі робяць круг*
*над расквітнелым садам,*
*над родным домам,*
*нівай урадлівай.*
*Развітваюцца.*
*Апошняй, нібы капітан,*
*з прышвартаванага ў лагуне*
*ціхай карабля*
*ўзлятае сама матка…*
*Не ўсцеражэш!*
*Ці можна ўсцерагчы таго,*
*каму няўхільна мосціць*
*Лёс сваю сцяжынку —*
*кладку ад берага да берага. І ўсё.*
*Узаўецца ў неба рой*
*і адляціць навекі,*
*каб ніколі не вярнуцца*
*да роднага парога.*
*І толькі тыя, хто не паспеў,*
*спазніўся памаліцца,*
*зноў вернуцца назад,*
*бо рана ім у гэтую дарогу.*
*Усё так, як бацечку майго*
*і ўвесь наш дзявочы род збалелы —*
*Марыю, Ганну, Ніну —*
*забрала маці ў снах маіх прарочых*
*спякотным жніўнем,*
*майскім разнатраўем,*
*шалёным ліставеем.*
*Толькі пакінула апошняй з роду*
*адвечны клопат свой радзінны.*
*З пчалінаю сям'ёю парадзелай*
*нястомна поўніць горкаю пыльцою —*
*пчаліным хлебам — ладзіць соты,*
*збіраць у Вырай новы рой.*

[1] Паэтэса Ніна МАЦЯШ нарадзілася 20 верасня 1943 года.

# «Невядомы» паэт Міхась РУДКОЎСКІ

Алесь КАСКО

Складанасць яго натуры як паэта і чалавека зведалі тыя, хто быў з ім блізка — на такой адлегласці, якую дазваляў ён сам, бо да канца жыцця заставаўся індывідуальнасцю, раўніва аберагаў яе, адчуваў сваю вартасць. Менавіта ён, інтэлігент-паляшук, стаў першым прафесіяналам-паэтам на Берасцейшчыне, калі за аснову першынства браць не членства ў Саюзе пісьменнікаў, дзе пiянерам быў Мікола Засім, а дасягнуты ўзровень майстэрства. Ды і папулярнасць у яго была не меншая, чым у папярэдніка.

Яго, выпускніка Брэсцкага педінстытута, асабліва цанілі філфакаўцы, да якіх у 1968 годзе далучыўся і я. Спазнаў перад тым немалы сорам. «А, из ганцевичских? — насeлі на мяне ў парозе інтэрнатаўская пакоя старшакурснікі. — Михася Рудковского знаешь? Читай наизусть или жить с нами не будешь». І справадзілі…

Сапраўдныя паэты — у вялікіх гарадах, а не ў вёсачках накшталт Вострава на рачулцы Нача; гэтак апраўдваўся ў 60-я гады заняпад краязнаўства і ў школах, і ўсюды. Адсюль паходзіла мая недасведчанасць. Аднак выправіць яе пашчасціла за адну ноч, якую са студэнтам-кніжнікам Алесем Зайкам мы прысвяцілі маладой беларускай паэзіі. Міхась Рудкоўскі быў ужо аўтарам двух зборнікаў, ды мяне найбольш кранулі «Сінія Брады» (1967), якія цяпер, думаю, і зрабілі паэту імя. Ці не ўсе памятныя вершы — у гэтай кніжцы:

*Мой дзед быў сельскім кавалём,*
*кавальскай справы каралём…*

*Мы помнім выразна і свежа,*
*што спее ў Турцыі ў садах,*
*а казку дзіўнай Белавежы*
*ледзь разбіраем па складах…*

Непасрэднае наша знаёмства адбылося на пасяджэнні абласнога літаб'яднання. Уладзімір Андрэевіч Калеснік тую сераду адсутнічаў, і рэй вёў Міхась Рудкоўскі. «Зямляк? — пасміхнуўся ў вусы ён, калі надышла мая чарга чытаць. — Давай, не пасрамі старыка…» І хутка адзін верш паявіўся ў газеце, праўда, пад «патрэбным» загалоўкам, але гэта ад Рудкоўскага ўжо не залежала.

Сябрамі — на «ты», хоць быў ён на пятнаццаць гадоў старэйшы, — мы сталі пасля майго вяртання з войска і аднаўлення вучобы ў інстытуце. Ён адзін з тых, хто рэкамендаваў мяне на рэспубліканскі семінар маладых літаратараў.

Міхась быў і рамантык, і сарамлівец, але быў і акцёрам. Не вельмі шчырымі мне падаваліся яго ныя хаванні за спіны калег падчас літаратурных выступленняў, з'едлівымі былі ягоныя экспромты, у якіх мы практыкаваліся гуртом, не бяскрыўдна гучала ягоная іронія, скіраваная нярэдка і на сябе. Аўтарытэтам для яго быў хіба што Уладзімір Калеснік, і то не заўсёды. Ён мог дазволіць сабе, чытаючы пераклады з украінскай, укрaпляць у іх свае новыя вершы, каб далі ім, не падазраючы сапраўднага аўтарства, неперадуузятую ацэнку. Як быццам усе вакол адно і рабілі, што хітравалі… Мусіць, прычына таілася не толькі ў суб'ектыўным характары. Двурушнасць тагачаснага ладу жыцця міжволі пераносілася і на блізкіх людзей.

Шчырая праўда, што горды і датклівы паэт рабіўся ўсё больш недаверлівым, хваравітая ўражлівасць перарасла з цягам часу ў манію праследу. Узгараўся або ненадоўга замыкаўся ў сабе, дзвярэй не адчыняў, на тэлефонныя званкі не адказваў. Потым тэлефанаваў сам, выбачаўся, запрашаў. Сябры ахвотна адгукаліся, цэнячы ў ім галоўнае — талент.

У год Рудкоўскага[1], прынамсі, для мяне, — у ягоным канчатковым і вечным узросце (памёр ён у 55 гадоў) зноў і зноў звяртаюся да творчасці земляка. Яна ніколі не пераставала мне падабацца — ні ў яе рамантычным размаху, язычніцкім паяднанні з Палессем і цэлым Сусветам, ні ў пазнейшых яе матывах расчаравання, самотнасці, безвыходнай тугі. Аднак па-сапраўднаму люблю раннюю і самую познюю. А паміж імі былі зрывы. Цяжка сказаць, што першым ускружыла галаву маладому, прыгожаму, таленавітаму паэту, а пасля запатрабавала платы: зямныя музы, медныя трубы ці «зялёны змей». Ён пачаў паўтарацца, пісаць нярвова, радок рабіўся зрэджаным, слова мялела… У зборніках 70-х і пачатку 80-х гадоў, неспрыяльных для паэта, я, улюблёны здаўна чытач, проста змушаў сябе знаходзіць візіткавыя, існыя вершы Міхася Рудкоўскага. І, канечне, знаходзіў: «О, Скарыны зямля, не скароная воляй і духам, // край Купалы і мілае песні купальскае край!..» Знаходзіў і ў тым, што кантраставала з такой узнёсласцю: «У свеце — ні сцюжы, ні бойні: // хораша, весне, спакойна… // З нябожчыкам новым спакойна // зварочваў на могілкі конь».

І ўсё ж лебядзіную песню паэт праспяваў — зборнікам «Гарынь» (менш за ўсё ад назвы ракі, а найперш ад «гарэння»), які выйшаў у 1992-м, праз год пасля зямнога жыцця аўтара. Вершы тут роўныя, глыбокія, мужныя ў сваёй развітальнай споведзі, змястоўныя і разнастайныя ў жанравых формах. Уражвае кароткі верш — знічкі, як назваў паэт. Гэта іскрынкі або згусткі думак і пачуццяў, люстрынкі перажытага, выпакутаванага: «Рушыцца ў свеце ўсё: // Горы, імперыі, нацыі. // А застаюцца адны // Травы і маці».

Ён прадбачліва ўпарадкаваў і надрукаваў амаль усё, што напісаў. Хіба тое-сёе засталося ў лістах да сяброў ды ў рукапісным архіве. Як гэты верш, не датаваны, але мне вядома, што з'явіўся ён у пару «гарынскіх» вершаў. Міхась прывёз яго з Дома творчасці пісьменнікаў, што паблізу гарадка Ракаў. У ім — горкая, але ратавальная паэтава іронія… Дазволю сабе прывесці верш цалкам, без ніякіх змен, з аўтографа.

[1] Сёлета адзначаецца 90-годдзе з дня нараджэння паэта.

**Не паеду!**

*Не шукайце ў Ракаве ракаў,*
*Не шукайце ў ракаве піва.*
*Мужыкі ходзяць ў Ракаве ракам,*
*А за імі — жанкі сарамліва.*

*Я паехаў учора у Ракаў,*
*Я спаткаў неблагую жанчыну,*
*Ды паслала яна мяне ў с…*
*Без усякай на тое прычыны…*

*Мужыкі хай становяцца ракам,*
*На каленях кабеты хай моляць —*
*Не паеду на піва у Ракаў,*
*Да жанчын жа — тым болей!*

Не гэтай фрыволінай, вядома ж, хочацца паставіць кропку ў сваіх успамінах. Думка перакідваецца да радкоў ранняга Рудкоўскага пра каваля-караля, які «не паміраў, а дагараў… згараў, як вугаль у горне». У горне пакутаў згараў і Міхась: хворага на рак лёгкіх, яго доўга трымала моцнае сэрца, вызваляла з частых рэанімацый ды адно дадавала агню. Яно спынілася ў купальскую ноч, але сябры пачулі яго, з жалем прайшлі Міхасёў апошні шлях — да калыскавай хаты ў Востраве, а потым да бяроз і соснаў за вёскаю, дзе цяпер помнік з ягоным радком: «Не вечны чалавек, — яго ж памкненні — вечныя».

Калі бываю тут, мізэрнымі здаюцца нашы спрэчкі і непаразуменні, а згадваецца добрае, светлае. Згадваецца Паэт — няпросты ў жыцці і такі бязмежна шчыры ў творчасці.

**2006 г.**

# Альгердавічы: «літоўскія крэчаты» на полі Куліковым

## Андрэй Полацкі і Дзмітрый Бранскі



Андрэй Полацкі.
Малюнак Паўла ТАТАРНІКАВА

Ірына МАСЛЯНІЦЫНА, Мікола БАГАДЗЯЖ

8 верасня 1380 года адбылася праслаўленая Кулікоўская бітва, героямі якой сталі таксама князі з Вялікага Княства Літоўскага Андрэй і Дзмітрый Альгердавічы.

Князь Андрэй, самы старэйшы з Альгердавых сыноў, што пры нараджэнні атрымаў язычніцкае імя Вігунт, нарадзіўся ў 1325 годзе. Маці яго была праваслаўная князёўна Марыя Віцебская. І яна выхоўвала сына ў павазе да хрысціянства. Аднак акунуцца ў хрысцільную купель княжычу давялося толькі ў 1342 годзе. У той год разам з бацькам сваім адбіў Вігунт нашэсце крыжакоў на пскоўскія землі. Удзячныя псkавічы, памятуючы пра тое, як аддана абараняў іх інтарэсы літовец Даўмонт, прапанавалі Альгерду альбо Вігунту застацца княжыць у Пскове. Альгерд дабраславіў на княжанне сына і дазволіў яму дзеля гэтага хрысціцца. Але Вігунт-Андрэй тады прасядзеў у Пскове нядоўга. Ён пакінуў свайго намесніка і выехаў на землі цяперашняй Беларусі дапамагаць бацьку і дзядзьку свайму Кейстуту ў іх барацьбе з крыжаносцамі. Псkавічы чакалі свайго князя доўгіх шэсць гадоў. У 1348 годзе намеснік Андрэя, Юрый Вітавіч, загінуў у бітве, і пскоўскае веча пастанавіла абвясціць Андрэю пра свой недавер.

Андрэй, які якраз у гэты год атрымаў і Полацкае княжанне, паспрабаваў было сілай прымусіць псkавічоў лічыцца з ім. Але тыя не далі яму такой магчымасці, паказаўшы ў поўнай меры, на што здольнае добра абвучанае вопытнае пскоўскае войска. Ніхто і не думаў, што пасля такога непаразумення Андрэй Альгердавіч калі-небудзь зноў вернецца ў Пскоў. Але тое адбылося.

Пасля Альгердавай смерці ў 1377 годзе Андрэй як старэйшы сын прэтэндаваў на вялікакняскі прастол. Да гэтага часу ён ужо паспеў заявіць пра сябе як пра выдатнага палкаводца. Вясной 1366 года абараніў Полацк ад крыжакоў магістра Вільгельма. У 1373 і 1374 гадах вадзіў полацкія дружыны на Дынабург. У 1375-м разам з дзядзькам Кейстутам хадзіў пад Крэйцбург. Найбольшую ж славу здабыў Андрэй Полацкі ў 1376 годзе, калі на ста ладдзях раптоўна з'явіўся пад сценамі крыжацкага замка Розітэн. Крыжакі зачыніліся ў сваёй цвержы. Але ўначы запалала зямля вакол замка. Усё, што магло гарэць у наваколлях Розітэна, да раніцы ператварылася ў попел. Каб адпомсціць адважнаму полацкаму князю, магістр узяў у аблогу Новы замак у Полацку. Аднак, нягледзячы на наяўнасць чатырох аблoжных машын і двух катапультаў, трынаццацідзённая аблога скончылася нічым.

Паводле Альгердавага тэстаменту ўлада мусіла дастацца малодшаму Андрэеваму брату, сыну другой Альгердавай жонкі Ульяны Ягайлу. Андрэй адмовіўся прысягаць новаму гаспадару і пачаў самачынна называць сябе вялікім князем Літоўскім. Але сіл адстойваць свае правы зброяй у яго не было. Пазбавіўшыся па волі Ягайлы і Полацка, і іншых сваіх гарадоў, рушыў Андрэй са сваёй вернай дружынай ў Пскоў. З пакаяннем і клятвамі.

І прынялі яго псkавічы, якія ўвесь гэты час з вялікай цікавасцю назіралі за ратнымі подзвігамі Альгердавіча. Усё ж такі Андрэй быў слаўным ваяром. І сям'я князя, якую прывёз на гэты раз ён з сабой у Пскоў, усім спадабалася. Набожная добрая княгіня, трое цудоўных княжычаў, Міхаіл, Сямён ды Іван...

А ў 1379 годзе разам з маскоўскімі рацямі Андрэй Альгердавіч вяртаецца на землі Вялікага Княства Літоўскага і вяртае сабе Полацк. У часе пахода гэтага лёс зводзіць яго з родным братам Карыбутам-Дзмітрыем Альгердавічам, які атрымаў ад Ягайлы Трубчэўск, Старадуб і Бранск, што раней належалі Андрэю.

Варта было чакаць, што браты сыйдуцца ў смяротным паядынку. Але Дзмітрый з хлебам-соллю сустрэў Андрэя. Аказваецца, ён таксама быў незадаволены панаваннем Ягайлы. І таму паспяшаўся прысягнуць як васал Дзмітрыю Маскоўскаму. Пэўна, менавіта тады Дзмітрый Альгердавіч папрасіў у Дзмітрыя Іванавіча і руку яго сястры Любові, якая пазней нарадзіла яму дваіх сыноў, Івана і Андрэя. Натуральна, Трубчэўск, Старадуб і Бранск перайшлі пад уладу Вялікага Княства Маскоўскага. А Дзмітрыю Альгердавічу быў дадзены ва ўдзел Пераяслаў-Залескі. І Андрэй, які пры дапамозе вялікага князя Маскоўскага зноў стаў князем полацкім і пскоўскім, не выказаў сваёй нязгоды. Тым больш, што ў Маскве ўжо ішла падрыхтоўка вялікай бітвы з татарамі. Альгердавічы як васалы Масквы павінны былі падзяліць трыумф альбо смерць з Дзмітрыем Маскоўскім.

8 верасня 1380 года на Кулікоўскім полі сышліся воінства Русі і лепшыя сілы Залатой Арды. 100-тысячнаму войску хана Мамая супрацьстаяла 36-тысячная руская раць. Русь выставіла супраць Арды 24 цяжкаўзброеныя пешыя палкі і каля 12 тысяч конных віцязяў. Шматшэраговая сцяна, закаваная ў браню.

У цэнтры стаў вялікі полк, па баках ад яго — палкі правай і левай рукі. Андрэй Альгердавіч са сваім дзвюхтысячным войскам палачан і псkавічоў узначаліў правы фланг. Першымі ардынцаў павінны былі сустрэць конны вартавы полк князя Дзмітрыя Друцкага і перадавы полк. За асноўнымі сіламі знаходзілася бранская конніца рэзервовага палка пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Альгердавіча. Але галоўная хітрасць, козыр Дзмітрыя Іванавіча быў прыхаваны за левым флангам вялікай раці, у Зялёнай Дуброве, паміж рачулкай Смолкай і Донам. Тут знаходзіўся засадны полк, які ўзначальвалі князь Уладзімір Серпухоўскі і яшчэ адзін «збеглы з Літвы» князь Дзмітрый Карыятавіч Баброк Валынскі.

Усё было няясна, сумнеўна, страшна. Надзею давала толькі прароцтва святога старца Сергія Раданежскага, па добраславенне якога перад бітвай прыехаў у Свята-Троіцку абіцель Дзмітрый Іванавіч. Святы Сергій сказаў, што вялікай крывёю, але перамога прыйдзе.

Перад самай бітвай, не згаворваючыся адзін з адным, браты Альгердавічы прапанавалі вялікаму князю Маскоўскаму перайсці праз Дон і спаліць масты, каб у ратнікаў не было спакусы адступіць з поля боя. *«Калі будзем тут, слабым будзе воінства»*, — растлумачыў сваю пазіцыю Андрэй Полацкі, — *калі ж на іншы бок Дона пяройдзем, моцным і мужным будзе»*. І вялікі князь паслухаўся мудрай парады. Дзмітрый Маскоўскі перадаў свае княскія даспехі аднаму з баяр, узброіўся як просты воін і стаў у шэраг простых ратнікаў.

І вось падышоў хан Мамай. Паводле падання, спачатку сышліся ў двубоі віцязь-манах Свята-Троіцкай абіцелі Перасвет і татарскі батыр Чалубей. Яны жорстка сшыбліся, і абодва загінулі. Аднак Чалубей зваліўся з каня, а Перасвет утрымаўся. І тое было ўспрынята русічамі як знак пра магчымасць іх перамогі.

Ну а далей, як і задумаў вялікі князь Дзмітрый, ардынцы вымушаны былі атакаваць у лоб. Удар аказаўся страшным. Пачаў прагінацца вялікі полк, полк левай рукі — адступаць. Распавядалі, што кроў лілася, як вада, на прасторы дзесяці вёрст.

Дзмітрый Альгердавіч павёў на падмогу сваю конніцу. Але татары ўсё ж такі прарваліся ў тыл і сталі акружаць вялікі полк. Уладзімір Серпухоўскі, які вымушаны бяздзейнічаць са сваім засадным палком, горасна наракаў Дзмітрыю Баброку Валынскаму: *«Ці доўга нам тут стаяць? Якая з нас карысць? Глядзі, ужо ўсе хрысціянскія палкі ляжаць мёртвыя»*. Але Баброк Валынскі адказваў, што яшчэ нельга выходзіць з засады, бо вецер дзьме проста ў твар русічам. Праз пэўны час вецер перамяніўся. «Цяпер час!» — сказаў Баброк, і засадны полк кінуўся на татар.

Гэты ўдар вырашыў зыход бітвы. Татар ахапіла паніка. Полк правай рукі Андрэя Полацкага і рэшткі вялікага палка перайшлі ў наступленне. Ардынцы былі разбітыя! З вялікай славай вярнуліся пераможцы ў сем'і свае. А князя Дзмітрыя Іванавіча пасля гэтай перамогі сталі называць Дзмітрыем Данскім[1].

Апісваючы вялікія перамогі, так хочацца спыніць бег часу і менавіта ў гэтым месцы паставіць кропку, як у прыгожым гістарычным фільме пусціць заключныя цітры. Але рэальная чалавечая гісторыя надта далёкая ад дасканаласці. І вялікім героям вельмі часта даводзіцца пасля трыўмфу выпіць да дна кубак бедаў.

У 1387 годзе, калі адсутнаў Дзмітрый Данскі, Маскву асадзіў татарскі хан Тахтамыш. Праз тры дні ён узяў горад і спаліў яго. Дзмітрый Іванавіч плакаў на развалінах Масквы і пахаваў забітых на ўласныя грошы. Атрымаўшы сур'ёзную кантузію на полі Куліковым, Дзмітрый Данскі памёр ад яе вынікаў у 1389 годзе.

Уладзімір Серпухоўскі дабраахвотна адмовіўся ад сваіх правоў на Маскоўскі вялікакняжаскі прастол на карысць сына Дзмітрыя Данскога Васілія І. Ён памёр ў 1410 годзе, не дажыўшы двух гадоў да свайго шасцідзесяцігоддзя.

Лёс Андрэя Альгердавіча склаўся найбольш драматычна. Кулікоўская бітва праславіла яго і выклікала чорную зайздрасць Ягайлы. Тым больш, што сам Ягайла збіраўся далучыцца да Мамая, але не паспеў прывесці войска на поле бою.

Даведаўшыся пра тое, што Ягайла згадзіўся стаць польскім каралём, далучыць Вялікае Княства Літоўскае да Польшчы і ўсяляк садзейнічаць распаўсюджванню каталіцтва на праваслаўных землях Беларусі, Андрэй вярнуўся на радзіму і, зноў абвяшчаючы сябе вялікім князем Літоўскім, павёў барацьбу за правы адзінаверцаў. Але пацярпеў паражэнне і некалькі гадоў правёў у цямніцы. Слава князя была такой вялікай, што Ягайла не рашыўся яго забіць. Ён толькі патрабаваў адмовы ад дамаганняў на вялікакняскі прастол. Андрэй быў непахісным.

Толькі дзякуючы просьбе Вітаўта ў 1394 годзе праслаўлены вязень быў выпушчаны на волю. Некаторы час Андрэй служыў князю Вітаўту, які паручыўся за яго. А потым, у 1399 годзе, вымушаны быў прыняць удзел у няўдалым паходзе Вітаўта на Арду. Князь Андрэй быў ужо сямідзесяціпяцігадовым. Ён адчуваў сваю старасць. Баявыя даспехі цяжарылі плечы, рука стамілася трымаць меч, зрок слабеў. Ён прагнуў ужо спакою, ціхага, малітоўнага заканчэння жыцця. Але Вітаўт настойваў, каб герой Кулікоўскай бітвы ў гэтым паходзе быў побач з ім.

Ідучы на бітву, Андрэй Альгердавіч зрабіў шчодрыя ахвяраванні Полацкаму Траецкаму манастыру і царкве Іаанна Прадцечы, каб малілася чорнае і белае духавенства за мяцежную яго душу. Ён ужо ведаў, што прыме свой апошні бой. Сышоўшыся на рацэ Ворскле з воінствам хана Цемір-Кутлука, князь Андрэй біўся ў першых шэрагах. І загінуў, затрымліваючы татар, каб даць магчымасць рэшткам раці Вітаўта адысці.

Тут жа, ля вод крывавай Ворсклы скончыўся жыццёвы шлях князя Дзмітрыя Альгердавіча. Як і князю Андрэю, давялося зведаць яму цяжкасці вязніцы на радзіме. Пасля пераможнай Кулікоўскай бітвы Дзмітрый Альгердавіч атрымаў у дадатак да земляў сваіх Ноўгарад-Северскі. Аднак за год да смерці Дзмітрый вырашыў прынесці васальную прысягу Ягайлу, які стаў каралём Польскім. Пэўна, Дзмітрый Альгердавіч спадзяваўся на атрыманне з Ягайлавых рук намесніцтва ў землях Вялікага Княства Літоўскага. Аднак, намеснікам стаў другі ягоны брат па бацьку Скіргайла Альгердавіч. У 1391 годзе тэўтонскі грасмейстар Мальбарг заняў Гродна і Ліду. Скіргайла заклікаў Дзмітрыя Альгердавіча ісці супраць нахабнага крыжаносца. Ім удалося вызваліць захопленыя гарады, і Дзмітрый атрымаў у княжанне Ліду. Аднак ужо ў 1392 годзе яго выгнаў адтуль грасмейстар Руменгейм. Пазней Ліда была чарговы раз вызвалена, але без удзела князя Дзмітрыя. І Ягайла аддаў яе ва ўладанне Вітаўту.

А пасля Вітаўт стаў і Вялікім князем Літоўскім. І ён вылучыў Дзмітрыю ў княжанне Навагрудак. Не згадзіўся з гэтым горды Альгердавіч. Пайшоў адваёўваць сабе страчаную Ліду. Але быў разбіты і патрапіў у палон. Павініўся, адкупіўся, атрымаў волю. У 1393 годзе зноў пачаў княжыць у Ноўгарад-Северскім, адмовіўшыся пры гэтым плаціць Вітаўту даніну, бо «Ноўгарад-Северскі заўжды Маскоўскай вотчынай быў». Аднак, не далі Вітаўт і Ягайла забыцца дзёрзкаму родзічу пра сваю васальную прысягу. Быў ён зноў паланёны і зачынены ў цямніцы ў Вільні. Вітаўт вярнуў яму волю толькі дзеля таго, каб выкарыстаць воінскія здольнасці князя Дзмітрыя ў баі з татарамі. Разам з сынамі сваімі, Іванам і Андрэем, прыйшоў Дзмітрый Альгердавіч пад сцягамі Вітаўта на Ворсклу. Усе трое засталіся ляжаць на полі мёртвымі...

Жыццё — праходзіць, слава — ззяе праз стагоддзі пуцяводнай зоркай. Героі загінулі, але засталіся назаўсёды ў памяці нашай — дзякуючы пяру летапісца і яркім незабываемым радкам славутай сярэднявечнай паэмы «Задоншчына»: *«Сыны Літвы храбрыя, крэчаты ў ратны час і палкаводцы праслаўленыя, пад гукі труб іх спавівалі, пад шлемамі песцілі, з канца дзіды яны ўскормленыя, з вострага мяча ўспоеныя ў Літоўскай зямлі»...*

[1] *Ад рэдакцыі: каўчэг з мошчамі «маскоўскага» князя Дзмітрыя Данскога, выраблenага па благаславенні патрыярха Кірыла, у нашыя дні, паводле Мінабароны Расіі, «дзеля суцяшэння і перамогі», возяць па вайсковых частках, у тым ліку і тых, што ўдзельнічаюць у вайне з Украінай.*

# «Быць з тымі, каго праследуюць»: Федэрыка Гарсія ЛОРКА

Ігар ВІРАБАЎ

90 гадоў таму ў Гранадзе фашысты расправіліся з паэтам Федэрыка Гарсія Лоркам — улюбёнец усёй Іспаніі пражыў усяго 38 гадоў. Дакладная дата гібелі невядомая — забойцы пастараліся. Як мяркуецца, 18 жніўня 1936 года. Роўна праз месяц пасля пачатку франкісцкага путча і пачатку грамадзянскай вайны. Здавалася б, трагедыя даўно мінулых дзён. Памятная дата з календара. І толькі?

Усё якраз не так. Гэта ўсё не пра ўчарашняе, і нас сённяшніх датычыцца наўпрост. Як урок, прычым не вельмі засвоены. Чаму фашыстам трэба было пачынаць тапіць Іспанію ў крыві з паэта Лоркі — «спевака п'янага месяца»? Нават не проста забіваць — расправіцца так нахабна, подла, у пыл развеяць, так што дагэтуль ніхто не ведае, дзе яго магіла. Чаму, за што?

«А? Што? Якога Лорку? Ніякага вашага дона паэта ведаць не ведаю, ды і не хачу. Шукайце, калі вам так трэба». Прыкладна так адказаў праз пару месяцаў зубасты генерал Эспіноса на трывожную тэлеграму Герберта Уэлса: пісьменнік узначальваў тады міжнародны праваабарончы Пэн-клуб. Быў ужо кастрычнік 1936 года — пра лёс Гарсія Лоркі не было вядома нічога: ні прысудаў, ні афіцыйных паведамленняў ніхто не апублікаваў. Два месяцы рэспубліканскія газеты перажоўвалі чуткі...

Але трэба ў двух словах нагадаць перадгісторыю. У студзені 1930-га іспанскі дыктатар Прыма дэ Рывэра быў змушаны сысці ў адстаўку. Увесну 1931 года на выбарах перамаглі рэспубліканцы і сацыялісты — і ўжо 14 красавіка была абвешчана Рэспубліка. Кароль Іспаніі ў жаху збег. Рэспубліку, вядома, раздзіралі супярэчнасці, партыі грызліся, урады змяняліся. Іспанія жыла надзеямі і натхненнем. Але 18 ліпеня 1936 года ў іспанскім Марока пачаўся ваенна-фашысцкі мяцеж. Адтуль ён перакінуўся ў Іспанію. Генерал Санхурхо, які ўзначальваў мяцежнікаў, загінуў у першыя ж дні ў авіякатастрофе, і яго змяніў генерал Франка. Тады і знік у Гранадзе паэт Лорка.

Путчысты шукалі яго мэтанакіравана. Ён спрабаваў схавацца ў прыяцеляў. Нехта выдаў. Павялі траіх. І далей — невядомасць. У тыя ж дні, раскажуць пазней родныя, забілі зяця паэта, мужа сястры, алькальда (мэра) Гранады лекара Мануэля Фернандэса Мантэсінаса.

## За што забілі паэта?

Шум пракаціўся па ўсіх еўрапейскіх газетах. Адмоўчвацца было цяжка. Галоўны арганізатар іспанскай бойні, абсалютны нацыст і паплечнік Гітлера, генерал Франка праз год, у лістападзе 1937-га (грамадзянская вайна яшчэ ў самым разгары), убіваў словы, як цвікі ў труну паэта, у інтэрв'ю мексіканскай газеце «Прэнса»: «Сапраўдны талент гэтага пісьменніка з Гранады мне не дадзена ацаніць — але наўрад ці хтосьці ўспомніў бы пра яго, застанься ён жывым. Пра яго так шмат гавораць толькі таму, што чырвоныя выкарысталі яго імя для сваёй прапаганды. Факт застаецца фактам: гэты пісьменнік загінуў, бо звязаўся з бунтаўшчыкамі. Мы не расстрэльвалі ніякага паэта».

На няшчасце фашыстаў, Лорку не хацелі забываць. У 1940 годзе ў Гранадзе згатавалі фальшывы дакумент аб смерці Лоркі, прыплёўшы міфічных «сведак»: «Памёр у жніўні 1936 з прычыны раненняў, атрыманых падчас ваенных дзеянняў; труп быў знойдзены дванаццатага дня таго ж месяца на дарозе паміж Віснарам і Альфа». У 1943-м дыктатар Франка выдаць збор сваіх прамоў і заяў, выкрасліўшы з таго інтэрв'ю кінутую з выклікам хлуслівую фразу аб сваёй недатычнасці. Пазней — а кіраваў дыктатар да самай смерці ў 1975-м — яго балбатлівы стрыечны брат, ён жа давераны сакратар Салгада Араухa, прызнаецца ва ўспамінах, маўляў, генерал, вядома, прызнаваўся, што вялікага паэта «давялося расстраляць у першыя дні нашага руху. Даводзілася расстрэльваць самых значных з левых, а менавіта такім быў Гарсія Лорка». Але гэта прызнанне паўшэптам. А адказваючы на пытанні «Чаму?», «За што?», фашысты хутка памянялі тактыку. Важна было не проста пазбавіцца паэта — трэба зрабіць усё, каб яго не ператварылі ў сімвал барацьбы з фашызмам. Ды перавярнуць усё навыварат і не толькі мінімізаваць страты ва ўласным іміджы, але і ўпісаць сябе ў гісторыю выратавальнікамі нацыі, міралюбівымі героямі і донкіхотамі.

У лабараторыях тых гадоў апрабавалі будучыя фэйкі, імітацыі фальшывых «буч». Ужо ў 1936 годзе ў газетах прамільгнула версія: Лорку забілі рэспубліканцы — чырвоныя вар'яты страляюць па сваіх, каб баяліся. Следам ляцелі новыя версіі. Калі не чырвоныя, то проста «безадказныя» рабаўнікі з вялікай дарогі. Далей — напрыклад, бытавая сварка. Або вулічная перастрэлка, выпадковая куля — і такое ж бывае. З'явіліся версіі аб тым, што гэта разборкі ўплывовых кланаў Гранады — помста паэту за здзек з іх у п'есе «Дом Бернарды Альбы». Нарэшце — вядома, пра масонства і, натуральна, пра нетрадыцыйную арыентацыю. Усё пусцілі ў ход, абы не сказаць, што ён антыфашыст і што забіты за нянавісць да фашызму. А Франка, маўляў, наогул па просьбе сяброў паэта спяшаўся на дапамогу, хацеў выратаваць няшчаснага, але проста не паспеў: перастараліся, хутка расстралялі. Пры гэтым, як вядома, спачатку кнігі Лоркі палілі на плошчы, а потым амаль чатыры дзесяцігоддзі пры рэжыме Франка імя і кнігі яго ў Іспаніі заставаліся пад забаронай. У 1964 годзе сяброўка Федэрыка, французская паэтка Марсэль Оклер, якая працавала над кнігай «Жыццё і смерць Гарсія Лоркі», бамбавала іспанскія міністэрствы і пасольства ў Парыжы, патрабуючы вывучыць лёс паэта. Хтосьці ў МУС Іспаніі ўздрыгнуў пад гэтым націскам — і запатрабаваў справаздачу з Вышэйшага паліцэйскага ўпраўлення Гранады. Рапарт сапраўды склалі — ён датаваны 9 ліпеня 1965 года і падпісаны паліцыянтамі, але адразу ж паклалі пад сукно. Марсэль Оклер яго так і не ўбачыла, не дажыла. Толькі ў красавіку 2015 года копію гэтага дакумента апублікавала іспанская газета «El Diario». Каштоўнасць яго ў тым, што ў ім упершыню прыводзіцца прызнанне: Лорку забілі мясцкі генерала Франка. А за што — тут, відаць, паліцыянтам давялося збіраць усе існыя міфы. Блытана выкладаецца ўсё той жа набор: «масон», «блізкі да сацыялістаў», а таксама — геніяльная фармулёўка — «схільны да гомасэксуальных адносін, што агульнавядома, хоць ніводнага пэўнага пацверджання гэтаму факту не выяўлена». І пасля доўгіх словаблудстваў — у дакуменце рэзюмэ: «Гарсія Лорка быў неадкладна пакараны смерцю пасля прызнальных паказанняў, пасля чаго пахаваны ў яры». Прызнаўся ў чым? Ні слова.

Шмат гадоў брат паэта, яго сёстры і пляменніцы паўтаралі, што галоўным болем сям'і з дня забойства было адно: не даць франкістам і іх духоўным спадчыннікам прысвоіць Лорку. Не дазволіць ім пераканаць усіх нас у тым, што паэт забіты за нешта — толькі не за перакананні.

Гібель Лоркі сама па сабе стала ўрокам.

## У чым урокі Лоркі

У ліпені 1937-га ў Валенсіі адкрыўся другі міжнародны Кангрэс пісьменнікаў супраць фашызму — хвілінай маўчання і словамі ў памяць аб загінулым у Іспаніі Гарсія Лорку... Сусветнай інтэлігенцыі тады здавалася справай гонару не маўчаць, не рэфлексаваць, не абяцаць калі-небудзь асэнсаваць, а адстойваць лёс народаў у бітвах з фашысцкай ісцтай. Але пры чым тут Лорка? Ён жа быў беспартыйным і непалітычным? Сястра спытала — ён адказаў: «Я з партыі бедных». Пра сваю любімую кнігу «Цыганскае рамансера»: «Гранада навучыла мяне быць з тымі, каго праследуюць: з цыганамі, неграмі, яўрэямі, маўрамі». І ўвогуле, з кім павінен быць паэт? Ён запэўніваў: «На гэтай зямлі я заўсёды буду з тымі, хто пазбаўлены ўсяго, нават спакою галечы. Мы — я маю на ўвазе інтэлігенцыю, людзей, якія атрымалі адукацыю і не ведалі галечы, — заклікаmaking...

Але з прыходам Рэспублікі Лорка паставіў у мадрыдскім тэатры «Ла Барака» сваю п'есу «Мар'яна Пінеда». Жыхарка Гранады, маці дваіх дзяцей Мар'яна Пінеда стала народнай гераіняй пасля таго, як была пакарана ў 1831 годзе за тое, што вышыла сцяг з надпісам «Свабода, Роўнасць, Братэрства», — яе абвінавацілі ў змове супраць караля, і саўдзельнікаў яна не назвала. Маці спявала Лорку ў дзяцінстве песню пра гэтую легендарную Мар'яну. У 1933 і 1935 гадах подпіс Лоркі стаяў першым пад «Антыфашысцкім маніфестам». У лютым 1936-га таксама першым з трохсот стаяў яго подпіс пад адозвай «Інтэлігенцыя — з Народным фронтам». Лорка публікаваў лісты-звароты да іспанскіх працоўных. Падпісаў маніфест з патрабаваннем вызваліць з бразільскай турмы камуніста Луіса Карласа Прэстэса, цяжарную жонку якога Вольгу вывезлі ў нацысцкую Нямеччыну і там па-садысцку забілі ў эксперыментальнай клініцы Бернбурга. Ён не любіў несправядлівасць і права сытых кіраваць усім светам. «Кожную раніцу, прачынаючыся ў свеце, перапоўненым несправядлівасцю і брудам, хачацца крыкнуць: "Пратэстую, пратэстую, пратэстую..."»

У 1968 годзе Канстанцін Сіманаў з кінадакументалістам Раманам Кармэнам знялі дакументальны фільм «Гранада, Гранада, Гранада мая...». У гэтай карціне чылійскі паэт Пабла Неруда, які выдаў у Маскве кнігу вершаў «Іспанія ў сэрцы», успамінае перад камерай свае апошнія сустрэчы з Лоркам: «З Федэрыка мы бачыліся вельмі часта, амаль кожны дзень. У ім было нешта ад духу Іспанскай рэспублікі, ад новага, клапатлівага гучнага духу іспанскага народа. У першы дзень франкісцкага мецяжу мы дамовіліся сустрэцца з Федэрыка, каб паглядзець адзін баявы спектакль. За два дні да таго ён пачуваўся вельмі добра. Хтосьці параіў яму на час пакінуць Мадрыд, і мы ўжо не сустрэліся, Федэрыка з'ехаў у Гранаду». Чаму забілі Лорку — Няруда тлумачыў: вядома, не выпадкова. «Страляючы ў яго, мецілі ў сэрцы народа».



Федэрыка Гарсія ЛОРКА

У верасні 1973 года ў Сант'яга пачаўся фашысцкі путч. Камандаваў генерал Пiначэт. Забілі прэзідэнта Альендэ — сябра Пабла Неруды. Паэта і спевака Віктара Хару чатыры дні катавалі электрычным токам, збівалі, перабілі рукі, праламалі галаву, пасля чаго расстралялі — 44 кулі. Уварваліся ў дом да смяротна хворага Няруды ў «пошуках камуністаў і зброі». Пад вокнамі яго дома ля берага паставілі вайсковы карабель. Па дарозе ў шпіталь дапытвалі і абшуквалі некалькі разоў. У клініцы Неруда скканаў... Праз шмат гадоў астанкі паэта эксгумавалі, знайшлі прыкметы атручвання — версію аб тым, што паэт забіты па загадзе Піначэта, не сталі ні пацвярджаць, ні абвяргаць. Тым больш, што часы змяніліся. І Піначэт услед за сваім фашысцкім братам Франка стаў выратавальнікам нацыі...

Калі паэтаў забіваюць — гэта нездарма.

## Постскрыптум

У той год, калі расправіліся з Федэрыка Гарсія Лоркам, таксама 90 гадоў таму загінуў яшчэ адзін іспанскі класік, аўтар «Жыцця Дон Кіхота і Санча» Мігель дэ Унамуна. Яго выгналі пры дыктатары Прыма дэ Рыверы. Вярнуўшыся, ён падтрымаў Рэспубліку, але тут жа перайшоў на бок Франка. Чаму? Таму што «не трэба крыві», «людзі стаміліся», «трэба навесці парадак і вярнуцца да нармальнага жыцця». Хто б спрачаўся. Але што рабіць, калі цябе ідуць забіваць? Унамуна верыў: яго не зачэпяць, адсядзіцца, ён рэктар Саламанкскага ўніверсітэта, яго ж — за што? Але 12 кастрычніка 1936 года на мітынгу ў яго ўніверсітэце паплечнік Франка генерал Хасэ Мільян-Астрай выступіў з заклікам: «Смерць інтэлігенцыі!» Рэктар Унамуна як чалавек прыстойны тут жа мовіў з трыбуны: «Не слухайце яго, гэты генерал — калека, пазбаўлены духоўнай велічы Сервантэса. Яго цешаць адны пачварнасці і калецтвы. А тут храм розуму — і я яго вярхоўны жрэц... Гэтыя людзі могуць перамагчы, бо ў іх грубая сіла. Ім не хапае розуму і справядлівасці...» Пісьменніка-рэктара перабіў раз'юшаны генерал Мільян-Астрай. Ён гарлапаніў: «Смерць інтэлігенцыі! Няхай жыве смерць!»

Унамуна звольнілі, пасадзілі пад хатні арышт. Зразумеў ён, як памыляўся, ці не, але літаральна праз некалькі дзён Унамуна раптоўна скканаў. Разрыў сэрца. Дыктатар Франка і тут ні пры чым? Генерал гідліва скажа: надта ўжо недарэчы вылез гэты Унамуна.

Не шанцавала з паэтамі фашысту...

## Архіў Альбера КАМЮ

Французская дзяржава завяршыла здзелку па набыцці найбуйнейшага архіва Альбера Камю. Кошт пакупкі склаў 9 мільёнаў еўра. Матэрыялы перайшлі ў фонды Нацыянальнай бібліятэкі Францыі, дзе іх аблічбуюць і паступова адкрыюць для даследчыкаў і публікі.

Аб'ём архіва ўражвае: 50 пагонных метраў матэрыялаў. Сярод дакументаў — рукапісы раманаў, эсэ, п'ес, працоўныя сшыткі, дзённікі, запісныя кніжкі, газетныя артыкулы, фатаграфіі і асабістая перапіска пісьменніка. Адмысловую каштоўнасць уяўляюць арыгінальны рукапіс рамана «Чужаніца» і чарнавікі няскончанага рамана «Першы чалавек», знойдзеныя пасля гібелі Камю ў аўтакатастрофе ў 1960 годзе.

У архіве таксама захоўваюцца дакументы часоў французскага Супраціву і перапіска, якая адлюстроўвае ўдзел пісьменніка ў інтэлектуальным і палітычным жыцці Францыі сярэдзіны XX стагоддзя.

Да згаданай здзелкі бібліятэка мела толькі асобныя матэрыялы пісьменніка, уключаючы рукапіс «Чумы» і частку перапіскі з паэтам Рэнэ Шарам. Новы набытак завяршыў фармаванне асноўнага збору дакументаў Камю. Куплю прафінансавалі дзяржава, модны дом Hermès і банк CIC.

У 2024 годзе архіў атрымаў статус аб'екта выключнага культурнага значэння. Увесну 2027 года, да 70-годдзя прысуджэння Камю Нобелеўскай прэміі, адкрыецца выстава, дзе будуць прадстаўлены рукапісы і іншыя матэрыялы з архіва.

## Расійская кніжная статыстыка

Расійская кніжная палата апублікавала статыстыку за першую палову 2026 года. Самымі тыражуемымі аўтарамі, як і год таму, застаюцца Анна Джэйн і Фёдар Дастаеўскі. З прадстаўленых на сайце Расійскай кніжнай палаты дадзеных вынікае, што са студзеня па чэрвень 2026 года сумарны наклад выданняў (кніг і брашур) склаў 150,8 млн. экзэмпляраў супраць 172,5 млн. экзэмпляраў у першыя шэсць месяцаў мінулага 2025 года.

Самым выдаваным аўтарам мастацкай літаратуры па накладах, як і ў першым паўгоддзі 2025 года, стала Анна Джэйн (псеўданім расійскай пісьменніцы Анны Патапкінай, вядомай па шматлікіх маладзёжных раманах пра каханне). За ёй ідзе Фёдар Дастаеўскі, а следам Стывен Кінг. Сярод аўтараў дзіцячай літаратуры лідзіруе Алена Ульева, а таксама Андрэй Усачоў і Карней Чукоўскі.

## Дом Стэфана ЦВЭЙГА

У Зальцбургу (Аўстрыя) на продаж выстаўлены асабняк Пашынгер Шлесль — былы дом пісьменніка Стэфана Цвэйга, у якім пісьменнік тварыў і дзе бывалі найбуйнейшыя дзеячы культуры XX стагоддзя. Маёнтак размешчаны ў паркавай зоне на гары Капуцынерберг і з 2020 года належыць нямецкаму аўтамабільнаму магнату Вольфгангу Паршэ. Кошт аб'екта складае 14,7 мільёна долараў.

Стэфан Цвэйг набыў асабняк у 1917 годзе для адасобленай працы. Даследчыкі называюць гэты перыяд самым плённым у яго кар'еры: менавіта тут была напісана навэла «Амок», якая прынесла пісьменніку сусветную вядомасць. У доме рэгулярна бывалі выдатныя сучаснікі Цвэйга: Томас Ман, Герберт Уэлс, Джэймс Джойс, Поль Валеры, Морыс Равэль, Рыхард Штраўс і Артура Тасканіні. Французскі паэт Жуль Рамэн ахрысціў маёнтак «вілай Еўропа».

Петыцыя з заклікам забяспечыць публічны доступ да асабняка, які прадаецца, сабрала звыш шасці тысяч подпісаў. Рэктар Зальцбургскага ўніверсітэта Бернхард Фюгеншух выказаў надзею, што навучальная ўстанова зможа набыць нерухомасць і надаць ёй статус значнай культурнай прасторы.

Нагадаем, што лёс Цвэйга цесна звязаны з трагічнымі падзеямі першай паловы XX стагоддзя. У 1934 годзе, праз год пасля прыходу Гітлера да ўлады, у доме Цвэйга (пісьменнік меў яўрэйскія карані) правялі ператрус, пасля чаго яго ўладальнік пакінуў Аўстрыю і з'ехаў у Англію. Пасля анэксіі Аўстрыі ў 1938 годзе маёмасць сям'і канфіскавалі, кнігі знішчылі, а рахункі замарозілі. У 1942 годзе Стэфан Цвэйг і яго другая жонка ў Бразіліі закончылі жыццё самагубствам.



## Знікненне рэдкіх выданняў

У Парыжы адбыўся суд над сямю грамадзянамі Грузіі, падазраванымі ў датычнасці да серыі крадзяжоў рэдкіх выданняў расійскай літаратурнай класікі з бібліятэк Францыі і іншых еўрапейскіх краін. Паводле следства, прадметамі крадзяжоў былі каштоўныя кнігі XIX стагоддзя, у прыватнасці, творы Аляксандра Пушкіна і Мікалая Гогаля. Агульны кошт скрадзеных выданняў ацэньваецца ў мільёны еўра. Абвінавачаным інкрымінуецца ўдзел у злачыннай змове і падрыхтоўка злачынстваў, а некаторым з іх таксама інкрымінуецца крадзеж культурных каштоўнасцяў. Максімальнае пакаранне па гэтых артыкулах — да 10 гадоў пазбаўлення волі.

Двое абвінавачаных знаходзяцца ў вышуку і будуць асуджаны завочна. Двое іншых — Міхаіл З. і Бека Т. — ужо былі асуджаныя ў іншых краінах за падобныя злачынствы і часова пераведзены ў Францыю для ўдзелу ў працэсе.

Паводле следства, удзельнікі злачыннай схемы наведвалі бібліятэкі пад выглядам даследчыкаў, заказвалі рэдкія выданні для працы, фатаграфавалі і вымяралі іх, а пазней вярталіся, каб замяніць арыгіналы амаль неадрознымі копіямі.

Сярод пацярпелых устаноў — Нацыянальная бібліятэка Францыі, Бібліятэка моў і цывілізацый у Парыжы і бібліятэка Вышэйшай школы ў Ліёне. Падобныя крадзяжы былі таксама зафіксаваны ў Германіі, Швейцарыі і Чэхіі. Следчыя мяркуюць, што выкраданні маглі быць часткай дзейнасці арганізаванай міжнароднай сеткі. Менавіта гэтыя расследаванні сталі падставай для стварэння сумеснай следчай групы з удзелам Еўрапола і Еўраюста, якая ў 2024 годзе правяла шэраг арыштаў. Адзін з падазраваных наведваў Нацыянальную бібліятэку Францыі каля 40 разоў, сцвярджаючы, што праводзіць даследаванне дэмакратыі ў рускай літаратуры XIX стагоддзя. Пазней у бібліятэцы высветлілася, што дзевяць рэдкіх выданняў былі заменены копіямі.

Шкода ацэньваецца прыкладна ў 650 000 еўра. Пакуль што ніводная з скрадзеных кніг не знойдзена. У Нацыянальнай бібліятэцы Францыі заявілі, што не губляюць надзеі на вяртанне культурных скарбаў.

## Асобнікі «Астрожскай Біблії»

Тры раней невядомыя асобнікі Астрожскай Біблії знойдзены ўкраінскім даследчыкам на Афоне. Гісторык і тэолаг Сергій Шуміла, дырэктар Міжнароднага інстытута афонскай спадчыны, выявіў іх у кнігасховішчы. Як напісала risu.ua, на сваёй старонцы ў Facebook ён нагадаў, што «ў гэтыя дні ў жніўні спаўняецца 445 гадоў з дня з'яўлення Астрожскай Біблії (1581 г.) — першага ўкраінскага друкаванага выдання поўнага корпуса Святога Пісання на царкоўнаслявянскай мове (1256 старонак). Гэта ўнікальны ўкраінскі нацыянальны помнік і святыня XVI стагоддзя. Усяго ў свеце да сённяшняга дня захавалася каля 350 асобнікаў Астрожскай Біблії».



Друкаваў тыя кнігі беларус Іван Фёдараў (Федаровіч), які мусіў збегчы ў Астрог ад Івана Жахлівага. Астрожская Біблія забяспечвала літургічныя патрэбы праваслаўнай царквы на працягу некалькіх стагоддзяў.

## Асуджаны нападнік на Салмана РУШДЗІ

Суд у ЗША прыгаварыў 28-гадовага Хадзі Матара да пажыццёвага зняволення за напад на брытанска-амерыканскага пісьменніка Салмана Рушдзі і падтрымку тэрарыстычнай дзейнасці. Прысуд завяршыў судовы працэс, на якім сам пісьменнік даваў паказанні.

Напад адбыўся ў жніўні 2022 года ў часе выступу Рушдзі ў штаце Нью-Ёрк. Нападнік нанёс пісьменніку больш за дзесяць нажавых раненняў. У выніку нападу Рушдзі страціў зрок на адно вока і некалькі месяцаў лячыўся. Паводле следства, Матар больш за год вывучаў фетву (афіцыйнае прававое рэлігійнае заключэнне ў ісламе), выдадзеную ў 1989 годзе пасля публікацыі рамана Рушдзі «Сатанінскія вершы». Прысяжныя прызналі яго вінаватым па ўсіх абвінавачваннях, у тым ліку ў аказанні матэрыяльнай падтрымкі «Хезбале», групоўцы, прызнанай ЗША тэрарыстычнай арганізацыяй.

Салман Рушдзі — лаўрэат Букераўскай прэміі, аўтар рамана «Дзеці поўначы». Пасля публікацыі «Сатанінскіх вершаў» пісьменнік шмат гадоў знаходзіўся пад вартай з-за пагроз на жыццё. Рэжысёр Алекс Гібні экранізуе мемуары пісьменніка «Нож: Разважанні пасля замаху», якія распавядаюць пра выздараўленне пасля нападу ў 2022 годзе.

## Карціны пісьменніцы Айрыс МЁРДАК

Іх знайшлі на гарышчы яе былога дома... І цяпер у Брытаніі рыхтуюць першую выставу жывапісу Айрыс Мёрдак. Сярод экспанатаў — адзіны вядомы аўтапартрэт пісьменніцы, чатыры сюррэалістычныя пейзажы і тры эскізы аголеных жаночых фігур. Ва Універсітэце Чычэстэра (University of Chichester) рыхтуецца выстава, прысвечаная жывапісу ангельскай пісьменніцы, лаўрэаткі Букераўскай прэміі. Упершыню публіцы прадставяць карціны, якія доўгія гады захоўваліся ў сакрэтным пакоі на гарышчы былога дома Мёрдак у Оксфардзе.



Аўтапартрэт А. МЁРДАК

Усяго падчас даследавання было выяўлена больш за 80 раней невядомых карцін Мёрдак. Працы адшукаў доктар Майлз Лісон, кіраўнік Даследчага цэнтра Айрыс Мёрдак пры Універсітэце Чычэстэра. Па запрашэнні распарадчыкаў спадчыны пісьменніцы ён вывучаў яе дом у Оксфардзе пасля смерці Одзі Бэйлі — другой жонкі былога мужа Мёрдак Джона Бэйлі. Таемны пакой быў схаваны за масіўнай кніжнай шафай, і, па словах Лісона, туды, верагодна, не заходзілі дзесяцігоддзямі. Пра яго існаванне маглі ведаць толькі сама Мёрдак і яе муж.

Апроч карцін у пакоі знайшлі асабістыя рэчы, а раней у іншай частцы гарышча — 600 неапублікаваных вершаў, у тым ліку прысвечаных жанчынам. Карціны ж былі створаны ў 1939—1941 гадах, калі Мёрдак вучылася ў Оксфардзе і перажывала важны інтэлектуальны этап: была ў Камуністычнай партыі, удзельнічала ў студэнцкай палітыцы і працавала ва ўніверсітэцкай газеце.

Яе сюррэалістычныя палотны, якія зведалі ўплыў Сальвадора Далі і Пабла Пікасо, як адзначаюць даследчыкі, «перадаюць настроі эпохі: пачуццё трывогі, адчуванне распаду грамадства і разбурэнне еўрапейскай культуры». Праз жывапіс Мёрдак спрабавала асэнсаваць стан Брытаніі і выказаць глыбокія філасофскія разважанні аб тым, што адбываецца.

Выстава пад назвай «Айрыс Мёрдак сярод мастакоў» адкрыецца ў бібліятэцы Універсітэта Чычэстэра і працягнецца да 10 снежня. У экспазіцыю ўвойдуць 25 работ, уключаючы аўтапартрэт (ад 7 студзеня 1941 года), які дазваляе ўбачыць, якой Мёрдак уяўляла сябе ў 21 год, а таксама творы мастакоў, якія афармлялі вокладкі яе кніг. Спецыялісты адзначаюць цесную сувязь ранніх мастацкіх доследаў Мёрдак з яе наступнай літаратурнай творчасцю. Так, скажэнне рэальнасці, характэрнае для яе сюррэалістычных карцін, пазней знайшло адлюстраванне ў раманах «Чорны прынц» і «Мора, мора», дзе героі па-асабліваму ўспрымаюць рэчаіснасць і паглыбляюцца ў свет уласных думак.

## Фільм пра маці Мэры ШЭЛІ

Міа Хансен-Лёве здымае баёпік (мастацкі фільм пра жыццё рэальнага чалавека, часцей за ўсё вядомай асобы) пра маці Мэры Шэлі. Карціна раскажа пра жыццё Мэры Уолстанкрафт (1759—1797), брытанскай пісьменніцы, аднаго з заснавальніц фемінісцкай філасофіі, аўтаркі трактата «У абарону правоў жанчын». Летам 2026 года стартавалі здымкі фільма «Калі каханне памрэ», прысвечанага жыццю брытанскай пісьменніцы і маці Мэры Шэлі, аўтаркі вядомага рамана «Франкенштэйн, або Сучасны Праметэй» і жонкі паэта Персі Бішы Шэлі ды сяброўкі Байрана. Галоўную ролю ў фільме выканае нарвежская актрыса Рэнатэ Рэйнсве. Дзеянне фільма адбываецца напярэдадні Французскай рэвалюцыі, аповед вядзецца пра лёс Уолстанкрафт — тады яшчэ юнай англічанкі з небагатай сям'і, якая вырашыла будаваць жыццё ў адпаведнасці з ідэаламі эпохі Асветы.